Зараз умовы зьмяніліся. Разам з царскім урадам распаліся са звонам ланцугі «черты оседлости» для еўрэяў. Перад ім раскрылася шырокая магчымасьць ініцыятывы і рассяленьня ў ва ўсе бакі. Зруйнаваньне «черты оседлости» найбольш зрабіць ўплыў на пралетарскія масы еўрэйства, бо для еўрэйскай буржуазіі «черта» амаль што не існавала. Вызваляный еўрэйскі пралетарыят раздасца, разамкне свае густые рады, каб уліць ў іх меньш энэргічнага і атсталага беларускага пралетарыя. Апрача гэтага, развіцьцё буйных дзяржаўных прадпрыемстваў, якое ўжэ пачалося у нашым савецкім горадзе, дасьць месца наогул значна большаму ліку пралетарыяў, каторые будуць будаваць свае новае жыцьцё.

Пры такіх умовах беларуская пралетарызаваўшаяся вёска пацячэ роўнай, эканамічна строга размяркованай рэчкай у пралетарскі горад. Яна пацячэ сюды са сваею вясковаю культураю і моваю, каторай цяпер ніхто не ставіць, як раней, прашкодаў, над каторай ніхто не пасьмее зьдзекавацца, каторая будзе розьвівацца і мацнець. Пойдзе так званая «паганізацыя» гораду. Горад афарбуецца ў вясковы культурны колёрыт. Само сабою разумеецца, што для нашай культурнай працы у новым горадзе трэба будзе цесна падыйсьці да новага пралетарыя беларуса на яго роднай мове.

Як мы сказалі вышэй, беларуская культура ёсьць культурай працоўных мас Беларусі; яна зьяўляецца культу-

рай значнай большасьці гэтых мас. Заданьні, як партыі, так і Савецкай улады ў адносінах да яе зусім ясны. Найперш ад ўсяго трэба зрабіць так, каб беларуская мова заняла ў дзяржаўных установах тое месца, якое яна займае у нашай вёсцы. Нам патрэбна разьвінуць і ўмацаваць суд, адміністрацыю, органы гаспадаркі, органы ўлады такіе, у якіх ужываньне беларускай мовы і веданьне беларускага быту і культуры адпавядала-бы патрэбам большасьці працоўных мас Беларусі. Апроч таго, трэба даць беларускай мове адпаведнае месца сярод нашых іншых мясцовых моваў у прэсы, у школе, у тэатру, у клюбна-асьветнае справе і ваогул у ва ўсех культурнаасьветных установах, як партыі, так і Савецкай улады. Дагэтуль намі яшчэ мала зроблена ў гэтым напрамку, але праца наша ўжэ ідзе пэўнаю дарогаю. Каб праца йшла барджэй, трэба як найхутчэй, не адкладываючы справы ў доўгую скрынку, падрыхтаваць не малы лік працаўнікоў для партыйнай, савецкай і культурнай працы на беларускай мове. Для гэтай мэты утвораны і утвораюцца адпаведальные курсы, як каротка-тэрміновые, так і доўгатэрміновые; беларуская мова і беларусазнаўства ўводзяцца ў ва ўсех школах, каторыя выпускаюць спэцыялістаў для Беларусі, не выключаючы Дзяржаўных Беларускіх вышэйшых учебных устаноў, як напрыклад, Унівэрсытэт і Політэхнікум. Вядзецца адпаведальная работа й сярод беларусаў-студэнтаў у межах Р. С. Ф. С. Р., напрыклад, у Маскве й Пецярбурзе. Працаўнікоў, ведаючых беларускую культуру і мову, трэба стварыць як найбольш. Зараз на іх ёсьць вялікая патрэба у нашай глухой вёсцы, а праз нейкі час будзе патрэба на іх і ў горадзе. Усё гэта нам трэба зрабіць для ўзмацненьня й паглыбленьня нашай камуністычнай і савецкай работы сярод працоўнай, пераважаючай этнаграфічнай большасьці па Беларусі.

Ёсьць сярод нашага грамадзянства на Беларусі два напрамка ў адносінах да нацыянальнага беларускага пытаньня. Гэтыя напрамкі часам пранікаюць нават і ў камуністычныя кругі. Гэтыя напрамкі—нахілы по нацыяналь-наму пытаньню істнуюць ня толькі у нас. Яны ёсьць і у другіх акраінах былушай Расійскай Імпэрыі. Вельмі ясна і праўдзіва вызначыў іх т—шч Сталін у тэзізах па нацыянальнаму пытаньню, прынятых Х-м зьездам Расійскай Камуністычнай Партыі.

Сутнасьць першага нахілу выяўляецца ў тым, што грамадзяне, вырасшые й выхаваные ў старых абставінах вялікарасейскай дзяржаўнай нацыі, ці блага бачаць, ці зусім ня бачаць асабліваасьцяў савецкай і партыйнай працы сярод беларускіх працоўных мас. Ім усё здаецца, што на сьвеце істнуе толькі велікаруская нацыя; што моцная велікаруская культура павінна скасаваць аслабленыя прэдыдучым эканамічна-палітычным укладам жыцьця культуры забітых і прыніжаных «инородцев», да якіх яны прылічаюць і беларускае сялянства і рабочыя масы. Гэты нахіл вядзе іх, ат нашага савецкага фэдэрацыйнага строю ў бок імпэрыялістычнай вялікадзяржаўнасьці, колёнізатарства і велікарасейскага шовінізму.

І цікава тое, што такімі шовіністамі і вялікадзяржаўцамі вельмі рэдка зьяўляюцца велікарусы, прыехаўшые да нас, каб тут працаваць. Найчасьцей гэта людзі тутэйшые, вышэдшые ў «людзі» з беларускай гушчы. Выходзячы ў «людзі», яны настолькі падпалі пад ассыміляцыённы ўплыў царскай расійскай школы, салдацкай вымраўкі і казармы, мяшчанскага, «квасскага» патрыятызму, што прывыклі ў ва ўсім нерасейскім бачыць нешто варожае ім, нешто недастойнае іх высокай увагі. У сваім мінулым яны былі лепшымі пастаўшчыкамі «истинно-русского» чыноўніцтва і царскай адміністрацыі. Зараз яны прыспасобіліся да сучаснага станавіска, прымазаліся да савецкіх установаў нашай Беларусі і ўносяць паўсюду з сабою дух ненавісьці і нецярпімасьці ў адносінах да ўсяго, што датычыць разьвітку і выяўленьня пралетарска-сялянскай «чорна-рабочай» культуры.

Ў адказ па першы нахіл сярод нашага грамадзянства зьявіўся другій нахіл у адносінах да культурна-нацыянальнага пытаньня. Ім хварэюць людзі, вырасшые і выхаваные у пяжліх

абостраных нацыянальна-сацыяльнаг-прыгняценьня нашага краю і вышоўшыя з беларускіх гушчаў. Яны бачылі на сваім веку ўціск, перажывалі зьдзек і нацыянальнае прыгняценьне царска-феўдальнага рэжыму.

Ім усё здаецца, што цяжкае мінулае яшчэ вярнецца, іх лякае прызрак мінулага, каторы ўжо ніколі ня вернецца на нашу бацькаўшчыну. Нацыянальныя асаблівасьці пралетарскіх і паўпралетарскіх масаў яны зьмешываюць з гэтак званымі «агульна-нацыянальнымі» адзнакамі ўсей беларускай нацыі, дзякуючы чаму астаюцца ў цені і ігнаруюцца клясавыя інтарэсы як беларусаў, так і усіх працоўных масаў. Гэты нахіл вядзе іх у бок буржуазна-дэмакратычнага нацыяналізму.

Абодва гэтыя нахілы у адносінах да нацыянальна-культурнага беларускага пытаньня павінны быць зьнішчаны сярод нашага грамадзянства, бо яны вельмі шкодзяць нашай працы. Асабліва трэба змагацца с першым нахілам, бо ён асабліва шкодны і асабліва апасны. З ім, к глыбокаму нашаму жалю, нам часта прыходзіцца спатыкацца ў сучаснасьці. Апроч таго, трэба адзначыць, што першы нахіл у большасьці выпадкаў, а можа і заўсёды, ёсьць прычына другога нахіла ў нашым грамадзянстве. Гэта ён выклікае зьнішчаны ўжо прызрак нацыянальнага прыгняценьня і штыркае грамадзянства да другога нахілу. Толькі пасьля зьнішчэньня першага нахілу—нахілу ў бок вялікадзяржаўнасьці, колёнізатарства і вялікарасейскаго шовінізму—можа быць зьнішчаным нахіл у бок буржуазна-дэмакратычнага нацыяналізму.

Наша лінія павінна быць простаю лініяю, каторая пройдзе паміж гэтых двух нахілаў. Яна добра вызначана ў тых тэзісах т-шча Сталіна, аб якіх мы ўжо гаварылі. Выяўляючы нацыянальнае пытаньне мы не перастаем быць інтэрнацыяналістамі ў самым праўдзівым сэнсе гэтага слова. Мы гаворым, што працоўныя масы ўсех нацыяў і ўсех культураў павінны злучацца, затым, што іх еднае прыналежнасьць да адзінага клясу пралетарыяў і полупралетарыяў. Абаронцы буржуазіі, да якой-бы нацыі яны ні належалі, хоць-бы нават і да беларускай, ёсьць нашы векавечные ворагі, з якімі будзем змагацца, шукаючы лепшай долі, але разам з тым мы будзем змагацца са ўсімі тымі, хто будзе ісьці проціў разьвітку рабоча-сялянскай беларускай культуры.

Праф. У. Ігнатоўскі.

Цені прошлага.

III.

Яшчэ за колькі гадоў да таго часу, калі мне давялося быць ў вастрозе, гэты астрог заўсёды пакідаў у мне сьляды цяжкага і моцнага ўражаньня. Калі, бывала, пазіраеш на Менск з раёну Брэскага вакзала, то гэты астрожны замак у першую голаву кідаецца ў вочы, засланяючы сабою горад. Едзеш на чугунцы ў Вільню, глядзіш на горад праз вакно вагона—зноў гэты ідал тырчыць перад тваімі вачыма. Нейкая сіла прыгнячэньня, нейкі цёмны вобраз людзкое пакуты адбіваліся і пазіралі з гэтых круглых цяжкіх вежаў, з гэтых панурых сьцен і муроў, з гэтых цёмных мартвячых вачэй—вакон. І нейкі жох авяваў тваю душу, калі перанасіўся думкаю ў нутро гэтых цяжкіх муроў і ўяўляў сабе становішча тых, хто воляю ці няволяю папаў туды. Варожы і страшны, ён гараваў, як які год, і як бы казаў: «Ты кружышся каля мяне, ты ненавідзіш мяне, а ўсё-ж такі ня выкруцішся табе з пад мае аблады».

Я памятаю адзін вечар. Сядзеў я на двары вучылішча сьляпых, адкуль гэты астрог выдзяляецца вельмі выдатна. Гэто было летам 1906 году. У той час астрог ужо быў повен «забастоўшчыкаў». У іх ліку быў адзін рэгент, нехто, калі ня памыляюся, Ва-

сілеўскі. Ён арганізаў ў вастрозе хор з нявольнікаў. Галасы знайшліся добрыя, і іх было многа. У тыя часы ў вастрозе жылося яшчэ вольна і не забаранялася сьпяваць песьні. Стройныя густыя, моцныя хвалі гукаў разьліваліся ў ціхім паветры ціхіх закраінаў горада. Тон, мэлёдыя гэтае песьні, як ня трэба лепей, стасаваліся і з цішынёю летняга вечара, і з характарам настрою самыя сьпевачоў, і з астрожным жыцьцём і рабілі вельмі моцнае ўражаньне, хвалюючы усю тваю істоту Тут было прогненьне волі, пратэст узбунтаванае душы, гнеў і жальба, і чуўся ў гэтай песьне нейкі пахавальны матыў.

«Там—пакута, там—загіна. Ніколі шчасьлівы сьмех не асьветліць у вастрозе твароў нявольнікаў, казала думка. Але псыхалёгія чалавека пабудована так, што самы факт і пераживаньні перад фактам рэдка калі супадаюць. Чаканьне пакуты вастрэй адчуваецца, чым сама пакута, страх сьмерці праўзыходзіць самую сьмерць. І нават на вайне ў гарачы момант збойства пад сьвістам пуляў і громам гармат ня так страшна, як страшны папярэднія перажываньні гэтага страхоцьця. І калі практыка астрожнага жыцьця паверала папярэднюю тэорыю яго, то прыходзілася ў гэтым праконвацца. Доўгія асеннія і зімнія вечары, калі камары запіраліся на ўсю ноч, часта праваджаліся такім радасным сьмехам, якіх ня кожны зазнае і на волі.

Сядзеў у нас у вастрозе адзін угалоўны, злодзей і разбойнік па прафэсіі і па прызваньню, малады, крэпкі, як дуб, поўны жыцьця чалавек. У перадзі яго чакалі блуканьні па астрогах, высылка і доўгія годы каторгі. Але на яго твару ніколі не адбівалася і цені пакуты. Ён ужо прайшоў суровую школу астрогу, меў вельмі стары арэстанскі стаж, карыстаўся у гэтым сэнсе ўвагаю і паважаньнем з боку звычайных абывацеляў астрогу і лічыўся адным з самых галоўных «Іваноў.»

Кожнае камара угалоўных мела свайго «Івана,» а то і некалькі такіх «Іваноў»: «Іван»—гэта начальнік заправіла камары, біч і страх арэстантаў. І званьне сваё і сваю пасаду яны набывалі самі. Але дзеля гэтага трэба было мець свайго роду цэнз.» Гэты «цэнз» складаўся з самае натуры... «Івана»: здаровых кулакоў, добрага горладзёрства і цьвёрдасьці і рашучасьці характару. «Іван» у каморы—Бог і цар, для якіх падзалежныя павінны былі служыць вераю і праўдаю і даваць падаткі. Угневаны «Іван» мог загнаць пад «нары» сваю ахвяру і аставіць яе там на ўсю ноч. Самым даходным матэр'ялам для «Іваноў» былі буржуі-купцы, або кожны больш-менш заможны чалавек, пасаджаны у вастрог. Такіе асобы дасьледжваліся «Іванамі» но конта іх маемасьці і гледзючы па палажэньню, накладаўся на іх падатак. Калі ў назначаны тэрмін гэты падатак ня ўносіўся, то «Іваны» білі сваю ахвяру, білі моцна бязьлітасна. Посьля гэтага даваўся новы тэрмін узносу падатку. Калі і у другі тэрмін «буржуй» ня нёс падатку яго білі яшчэ мацней, заганялі пад «нары» і не адступаліся да таго часу, покі падатак ня ўносіўся поўнасьцю. Ніякія жалобы і скаргі па чыннасьць «Іваноў» не памагалі, бо «Іваны» жылі ў добрай згодзе з адміністрацыей астрога і дзяліліся з ёю сваімі здабыткамі. З «палітыкамі» «Іваны» падтрымоўвалі добрыя адносіны і праз «Іваноў» можна было разабраць розныя кражы, учыняныя угалоўнымі. Было такое здарэньне. Праз «нарамі» ў нашай камары сталі мае новыя камашы. Радам была камара угалоўных. Трэба сказаць, што кожная камара злучалася з другою «тэлефонам.» Гэта была проста дзірка, прабітая ў сьцяне. Праз гэту дзірку-«тэлефон» вялася тая ці іншая пазычка, як, напрыклад, кубка чаю, цукру, тутуну і іншае; праз гэтую дзірку вяліся патрэбныя размовы з патрэбнымі людзьмі. Праз гэты-ж «тэлефон» шавец Сьвінкін украў і мае новыя камашы, ў часе гуляньня на дварэ астрога. Прышлося зьвярнуцца да «Іваноў» суседняе камары. Праз колькі мінут былі даны дакладныя справкі: Камашы украў шавец—Сьвінкін, які ўжо выйшаў на волю ўчора і вызваліў так сама і мае камашы. «Іван» нават памог мне набліжаваць і вельмі

шкадавау, чаму я не агледзіўся крыху раней.

І ўсеь алзін з гэтых «Івануў», аб якім ідзе гутарка, вызначаўся, як выдатны скакун. Бывала, на яго надыдзе такая мінута, калі чалавеку так хочацца разгарнуцца ва ўсю шыр свае натуры. Ня стрывае душа, нейкая бура надхопіць яе, і ён, расчысьціўшы сабе месца на камары, пускаецца ў скокі. Ногі закуты тоўстымі кайданамі, а ён скача, скача лёгка, мастацкі. Кайданы замянялі яму музыку. І ў гэтым была для яго асобная асалода і натхненьне. Ён так умеў падзвонімаць імі, падбіраць ужуры, што звон гэтых цяжэрных ланцугоў і уласны яго настрой зьліваліся ў адное цэлае. І калі ён скакаў, то скокі яго захоплівалі ўсіх. Разьмераны і нават музычны іх бразгат насіўся па карыдору, далятаў у другія камары. Самі астрожнікі—пазірачые сходзіліся да «ваўчка,» дзе адбываліся скокі, глядзелі, любаваліся скокамі аматара «Івана.»

Якуб Колас.

Бэтлейка.

(З нарысаў па гісторыі беларускага тэатру).

I.

Як рэлігійная містэрыя і школьная драма, так сама іхняя дачка - бэтлейка (ад слова Betlehem) нарадзілася ў Заходняй Эўропе. Да поўнага разьвіцьця бэтлейка дайшла ў Польшчы, скуль пранікла на Украіну і на Беларусь. У VII і VIII вякох гэтая драма, якая ставілася на Ражство, мела чысто рэлігійны зьмест.

Спачатку з бэтлейкай хадзілі па мястэчках і вёсках школьнікі—сэмінарысты. Потым ад школьнікаў бэтлейка перайшла да абыватэльства і ад абыватэльства—да няпісьменных сялян. Пры гэтым рэлігійны элемэнт бэтлеечнай драмы адсунулі на задні плян народныя бытавыя камічныя сцэнкі і сатыры на папулярных асоб і розных прадстаўнікаў грамадзянства таго часу.

Гэтакім чынам бэтлеечная драма перайшла ў чыста народную творчасьць. За ўсе XIX сталецьце бэтлейка ставілася ня толькі у мястэчках і вёсках Беларусі, але так сама па вялікіх месцох, як напр., Менск, Магілёў, Вільня Віцебск і г. д.

Бэтлейка гэта ёсьць маленькі тэатр-скрынка, дзе артыстамі зьяўляюцца марыянэткі-лялькі. Скрынка выяўляе сабой мініятурны тэатр з дахам. Пярэдняя сьцяна яго палатняная, якая падымаецца, як заслона ў тэатры ў час прадстаўленьня. На сцэне, пакрытай заячай скурай, рухаюцца (рукамі бэтлеечніка) лялькі - актеры. За іх гавора і пяе спэцыяліста-бэтлеечнік. Ён пры гэтым стаіць «за кулісамі» (за палатнянай заслонай) і трымае лялькі за дроцікі рукамі. Гэтых дроцікаў ня відаць, бо яны захаваны ў шчэлінах, прарэзаных на падлозе сцэна. Шчэліны так сама не прыкметны ў шэрсьці заячай скуры. Для рук бэтлеечніка ёсьць пад сцэнай спэцыяльнае пустое месца. Для ув'йсьці і выхаду марыянэтак, якія падае спрытна хлопчык-«сцынарыус», прарэзаны ў задней сьцяне сцэны маленькія дзьверцы. Паміж гэтымі дзьверцамі стаяць на сцэне дзьве лялькі, якія выяўляюць сабою матку Божыю і сьвятога Язэпа. Перад імі ў жолабе ляжыць дзіцёнак Езус. Часам да гэтай сям'і дадаецца вол і асёл. (Тут можна рабіць параўнаньне в стара-грэцкім тэатрам, дзе аўтар бога—Дыоніса так сама знаходзіўся перад сцэнай). У некаторых бэтлеечных скрынках гэтая група знаходзіцца ў спэцыяльным вышэйшым паверху за шклянаю шыбінай, супраціў сьвятога абраза, які вісіць на задней сьцяне. На даху бэтлейкі часам робіцца маленькая башня. У ёй з боку публікі ёсьць дзьверцы. Падлога ў маленькай башні круглая і круціцца на жалезным шкворне. Вакол башні прымацо-

ваны карагод дзяцюкоў і дзяўчат, якія трымаюцца за рукі. Гэта група называецца «Камароўскае вясельле.»

Архітэктура бэтлейкі наогул бывае рознае,—паводлуг фантазыі майстра і традыцыяў яго ваколіцы.

Пры ігры-прадстаўленьні, апроча маналёгаў і песьняў, у большасьці бывае і музыка: дуда, скрыпка, цымбалы і інш.

Бэтлеечная п'еса дзеліцца на дзьве часьці: першая часьць — рэлігійнага зьместу, а другая—бытавога-камічнага зьместу.

Першая частка выяўляе сабой сцэнічны твор пад назоваю «Цар Ірад.» Дзея пачынаецца перад групай, якая пастаянна знаходзіцца на сцэне (Божей Маці, сьвяты Язэп і дзіцё Езус). Два пастухі ў беларускіх вопратках падыходзяць да маці Божай і кланяюцца. Бэтлеечнік пры гэтым пяе пад акампанімэнт музыкі тропар Ражству Хрыстову. Пасьля пастухоў кланяюцца Хрысту два анёлы. Потым Адам і Эва жалобна прычытываюць аб сваім праступку перад Богам.

Другая сцэнка прадстаўляе Ірадаў пасад і ваякаў. Ірад прыходзіць у царскім адзяяньні. Бэтлеечнік пяе аб тым, як Ірад хоча забіць Хрыста, як зьяўляюцца валхвы. Далей прадстаўляецца гісторыя, як анёл загадаў Язэпу ўцякаць з сьвятой сям'ёю ў Эгіпэт. Потым—сьмерць Ірада: Д'ябал з целам Ірада правальваецца скрозь зямлю. Гэтым першая часьць бэтлейкі канчаецца.

Ёсьць яшчэ адна п'еса да бэтлейкі, якая часам замяняе першую. Яна называецца «Цар Максімілян». Складаецца з чатырох актаў. У першым акце, калі сын Максіміляна, Адольф, заяўляе, што верыць у Хрыста, бацька-цар загадае закаваць яго ў цяжкія кайданы са словамі: «Няхай адумаецца.» Але сын яго «Адольф, моцна трымаецца сваёй веры, за што кат забівае яго на сьмерць. У дальнейшых актах цар - Максімілян змагаецца з рознымі рыцарамі і цмокамі.

Гэтая першая галоўная часьць бэтлеечных прадстаўленьняў ня так падабалася публіцы, як другая часьць—дадатковыя сцэнкі бытавога-камічнага характару.

У канцы-канцоў першая частка, у большасьці была зусім зьнята з бэтлеечнага «рэпэртуару», асталася толькі, як пралёг, зьяўленьне пастухоў у сьвятую пячэру. Затое дадатачныя сцэнкі вельмі падабаліся публіцы і выклікалі шмат сьмеху і шчырага здавальненьня. Тут бэтлеечніку-артысту, апрача традыцыйнага тэксту, было багатае поле для імправізацыяў сьмяхатлівых куплетаў на тэмы дня. Ядранай калёрытнай творчасьці пры гэтым ня шкодзіла няпісьменнасьць (у большасьці) селяніна бэтлейшчыка. Як кажа праф. Карскі, ў бэтлеечным тэксьце цяжка нават выявіць, дзе канчаецца індывідуальны штучны твар і дзе пачынаецца народная калектыўная творчасьць (гл. артыкул праф. Карскага «Рождественская вертепная драма въ Бѣлоруссіи», беларуская часопісь» «Варта» № 1, Менск, 1918 г.).

У другой часьці бэтлейкі праходзіць цэлы цыкль камічных сцэнак, нічым ня зьвязаных паміж сабою: жыд, чорт, Іродыяда, Мацей і доктар, Мужык і яго сын Максім, Антон з казою і Антоніха, скамарох з мядзьведзем, цыган і цыганка, баба-варажбітка, доктар, купец (Вольскі), Кракавяк і Кракавянка, улан і уланка, казак і жыд, два рыцары, бэрнардынскі манах і, урэшце,—камароўскае вясельле.

Галоўная структура гэтых сцэнак складаецца з сьмешных маналёгаў і песьняў, пасьля якіх пары, у большасьці, цалуюцца і скачуць.

Мова ў большасьці мяшаная: беларуская, расійская, польская і украінская. Гэта залежыць ад таго, прадстаўнікі якой нацыянальнасьці выступаюць: Купец Вольскі гаворыць па польску, Мацей—па беларуску, жыд—блутанай беларускай мовай, казак—па украінску, а цыган—па расійску.

Нашыя вучоныя і этнографы—як напр.: праф. Карскі, Раманаў, Шэйн і інш.,—шмат пісалі аб нашай бэтлейцы. Ў іхніх працах ёсьць поўныя тэксты бэтлеечнага рэпэртуару ў некалькіх вар'янтах.

У часы друкаваньня газэты «Наша Ніва», так сама зьбіраліся матэрыялы па беларускай бэтлейцы, што відаць з розных артыкулаў памянёнай газэты, дзе друкаваліся спэцыяльныя прагра-

мы і анкеты аб зьбіраньні гэтых матэр'ялаў. У тыя часы (1910—1913 г.) бэтлейкай вельмі цікавілася вядомая беларуская пісьменьніца Цётка (памёрла ў 1916 г.), якая пазьбірала ў гэтым кірунку шмат матэр'ялаў.

Дзеля прыкладу даемо тут пару ўрыўкаў з бэтлеечнага рэпэртуару:

Мацей і доктар.

І-я зьява.

(*На сцэну выходзіць беларускі мужычок Мацей*).

Мацей. А ба! Як тут зелена, ясна, красна; не раўнюючы, як у касьцёле. Ага, тут і сьвяты Язэп ёсьць (*здымае шапку і кланяецца*).

Няхай будзе пахвалёны, Шапка сіня, верх зялёны. Ці ведаеце, паночкі, якая мяне бяда спаткала? Быў я у пана Бараноўскага па куцьлі,

Як аб'еўся я куці,
Ні сапсьці, ні дыхці,
Ні дамоў да маей жонкі Ульляны дайсьці.
Каб знайшоўся-б дахтарок,
Ды палячыў мой жыватоk,
Аддаў-бы яму торбачку ды мяшок.

2-я зьява.

(*Выходзе доктар*).

Доктар. Што ты, гад, тут разшумеўся ў панскіх пакоях?

Мацей. А паночак, Палячы мой жываточак.

Доктар. Што табе?

Мацей Бурчэньне, нястраўнасьць.

Доктар. Пакажы, гдзе пульс?

Мацей Так? (*дае руку*).

Доктар. Ня так.

Мацей. Бадай жа ты сьвету ня ведаў як!

Доктар. (*Бярэ Мацея за каўнер, б'ець яго аб сьцяну*).

Мацей—пацей! Мацей-пацей!

(*Доктар выходзіць, астаецца адзін Мацей*).

3-я зьява.

Мацей. Намацеў, папацеў і сам к чорту паляцеў. Гэтыя Менскія дактары

Выймаюць душу без пары;
Ня лечуць,
Ды яшчэ калечаць.
Казаў з патыліцы кроў пусьціць.
Напупе банкі паставіць
Казаў узяць моху, чарталалоху,
Гальлясу, купарвасу,
Мышыных вантробак,
Камарынага шмэльцу
І яшчэ нешта троху.
Зьмяшаў гэта я, збаўтаў,
Глынуў—не памагло,
Яшчэ горай прылягло.

4-я зьява.

(*Зьяўляецца жонка Ульляна. Мацей цалуецца з ёю і скача Лявоніху. Пры гэтым бэтлеечнік імправізуе розныя частушкі*).

Антон з казой.

(*На сцэну выходзіць Антон, які цягне на павадку казу. За ім ідзець яго жонка Антоніха*).

Антон. (Пяе):

Антон казу вядзе,
Тып-мыц, каза ня йдзе,
Антоніха падганяе,
На табаку зарабляе.
Антон на табаку,—
Яго лаюць, як сабаку;
Антоніха па муку,—
Яе лаюць, як суку.
А ты, каза, стой, стой!
(*Антоніха пачынае даіць казу*).
А я козу дой, дой,
А я козу кулаком,
Прападзі ты з малаком!

———

II.

Апрача чыста народнай бэтлейкі, былі спробы стварыць з гэтага сюжэту твор для сцэны. Пры выданьні каталіцкай беларускай газэты «Bielarus» у Вільні ў 1915 г. вышла з друку маленькая кніжачка «Betliejka.»—сцэнічны твор у пяці актах. Аўтар невядомы, але па ўсяму відаць, што гэта напісаў беларускі ксёндз. Сюжэт—раджэство Хрыста. Пэрсанажы-жыдоўскія рабіны, пастухі, анёл, Ірад, тры каралі, маці Божа, сьвяты Язэп і г. д. Мастацтвам гэты твар не вызначаецца, напісаны вельмі прымітыўна ў стылю школьных драм XVII веку.

А народная беларуская бэтлейка, якая болей ста гадоў забаўляла наша абывацельства і сялян, часткова замя-

няючы сцэну,—ў час вайны у 1915 г. зусім пазаўпала. Яе бадай нідзе не відаць было. Ў шмат мясцох нашага краю тэатры-бэтлейкі з сваімі трупамі —лялькамі спакойна спачывалі ў музэях пад тоўстымі коўдрамі пылу і павуціны. Рэжысэры-суфлёры-бэтлеечнікі,—розныя абывацелі з рамесьніцкіх цэхаў: шаўцы, краўцы, сталяры і інш, так-сама вясковыя сяляне,—у большасьці павымiралі. А калі ў каго з іх засталася ў спадчыну ад бацькі бэтлейка, дык ён ня ведаў як яе выкарыстаць, і бэтлейка ляжала ў яго на гарэ бяз жаднага ўжытку.

Але бэтлейцы суджана было перад самай сьмерцьцю яе выступіць у шырокі сьвет апошні раз, затое з такім посьпехам, як нікокі за ўвесь час яе векавога істнаваньня па Беларусі.

У 1915 г. ў самым разгары ўсясьветнай вайны, беларусы ў Менску, на манер іншых народнасьцяў краю, з'арганізавалі «Беларускі Камітэт дапамогі пацярпеўшым ад вайны.» Побач з дапамогай уцекачом ў памянёным камітэце, беларускія інтэлегянтныя сілы сканцэнтравалі культурнаасьветную працу беларускага адраджэньня. Ў розных памяшканьнях камітэту ўладжываліся вечарынкі, на якіх выпаўняліся беларускія песьні, дэклямацыі і скокі. Гэта зьяўлялася слабым працягам спыненага расейскім урадам беларускага друку.

Ня маючы, дзеля цэнзурных прычын, магчымасьці наладзіць праўдзівы тэатр, беларусы ў Менску ў час калядаў 1915 г. наладзілі бэтлейку. Арганізатарамі яе былі б. рэдактар Нашай Нівы» А. Уласаў і беларускі дзяяч У Фальскі.

Бэтлейшчыкі як раз знайшліся сярод менскага абывацельства з шаўцоў: Муравіцкі і Дэмбіцкі. Муравіцкі меў бэтлейку і ўсе прылады—лялькі, а Дэмбіцкі прадстаўляў сабой аркестра—акампанаваў на гармоніку. Гэта былі старыя бэтлеечнікі—прафэсыяналы, якія шмат гадоў падрад у Менску і ваколіцы ў калядныя сэзоны хадзілі з бэтлейкай да розных паноў, да шляхты: ў розныя вёскі і давалі спэктаклі.

З вялікім трудом удалося выхлапатаць дазвол у менскага губэрнатара, пасьля чаго часьць памяшканьня «Беларускага Камітэту» была нарыхтавана пад гэтае прадстаўленьне. Пакоі былі прыбраны ў беларускім стылю. Сьцены былі завешаны сялянскімі тканінамі, абрусамі, ручнікамі, аздоблены пекна каляровымі беларускімі паясамі. Апрача гэтага на сьценах віселі бяроставая пастырская труба, старыя цымбалы і цэлая калекцыя беларускіх абразоў маляра Сукоўскага. Былі выдрукаваны арыгінальныя афішы і расклеены па ўсяму гораду.

У пачакальнай салі аркестр музыкі граў беларускія народныя песьні. Так сама выпісалі з вёскі беларускага скрыпача з маленькім хлапчуком цымбалістам.

Пасьля таго, як прадстаўнік расійскай паліцыі праслухаў першую рэпэтыцыю» і упэўніўся, што ў бэтлеечным рэпэртуары няма нічога рэвалюцыйнага і крамольнага,—бэтлеечныя прадстаўленьні пачаліся.

Бэтлейка цягнулася цэлы месяц пасьля Каляд. Штодня адбываліся тры сэансы. У працягу месяца аўдыторыя заўсёды была поўная. Глядзець бэтлейку прыходзілі як звычайнае абывацельства, так сама і інтэлегэнцыя розных нацыянальнасьцяў. Гэта былі свайго роду этнаграфічныя вечары, на якіх публіка знаёмілася з нашым народным мастацтвам.

У гісторыі бэтлейкі гэта, бадай, адзінны факт, калі яна ладзілася інтэлігэнцыяй у рамках праўдзівага тэатру Посьпех беларускай бэтлейкі быў тады аграмадны: Пры адным і тым самым рэпэртуары бэтлейка ставілася дзень-у дзень па тры разы цэлы месяц—г. з. 90 разоў бязупынна. Ніводная клясычная драма на ўсім сьвеце такога шчасьлівага лёсу хіба ня ведае.

За гэты час адміністрацыя бэтлеечнага тэатру вывучыла на памяць увесь бэтлеечны рэпэртуар. Шмат хто з менчукоў пасьля гэтага дэклямавалі знамяніты маналёг «Мацея-Пацея». І сьпявалі старадаўныя песьні з беларускай бэтлейкі.

Але гэта быў апошні апофэоз нашай бэтлейкі, бо з тых часоў бэтлеечных прадстаўленьняў болей у нас ня відаць.

З. Бядуля.

Інстытут Беларускай Культуры.

У пачатку 1922 году пры Акадэмічным Цэнтры залажылася вышэйшая культурна-навуковая ўстанова на Беларусі—Інстытут Беларускай Культуры. Залажэньне гэтай культурнай навукова-дасьледчай установы выклікана самым жыцьцём. Няўхільным скуткам ўзросту нацыянальнай самасьвядомасьці зьяўляецца жаданьне ведаць тыя матэр'альныя й духоўныя скарбы, якія захаваны на Беларусі; бо быць нацыянальна сьвядомым—гэта значыць перш за ўсё ведаць культурнае багацьцё сваей нацы.

Але мы мусім заўважыць, што до самых апошніх часоў дасьледчая праца на Беларусі бадай што не знаходзіла сабе месца. Захапіўшы ў свае рукі і ўладу і навуку, расейцы з навуковага боку зусім не цікавіліся Беларусьсю, бо яна для іх, па выражэньню аднага рускага цара, была прыгожай нявестай, але без пасагу й, яна для іх навуковага дасьледаваньня давала мала карысьці. Толькі ад другой паловы мінулага сталецьця пачалася нейкая дасьледчая праца на Беларусі. Але й гэтая праца мела не сыстэматычны, а чыста выпадковы характар. Яна вялася зрусыфікаванымі ці спалянізаванымі беларусамі-вучонымі, якія ўбольшасьці глядзелі на беларускую культуру не як на культуру самастойную, а як на пабочную прыбудову да агульна рускай ці польскай культуры. Ня наша справа іх вінаваціць за гэта; у тыя часы сапраўднага нацыянальнага ядра ня было, й яны проста, быць можа, аддавалі даніну свайму веку.

Але мы павінны памятаць, што іх вывады заўсёды носяць характар тэндэнцыйны, і з гэтае прычыны часта трацяць сваю навуковую вартасьць.

Трохі інтэнсыўней дасьледчая праца вяддзеца ў 20 сталецьці. Над дасьледаваньнем Беларусі ўжо працуюць ня толькі рускія, польскія і нямецкія вучоныя, але й самі беларусы, якія ўжо цьвёрда стаяць на нацыянальным грунце і подходзяць да справы без усякай тэндэнцыйнасьці. Гэтыя лепшыя сыны Беларусі адразу зразумелі, што для нацыянальнага адраджэньня народу перш за ўсё патрэбна выяўленьня яго культурнага багацьця, і яны стараюцца адзяліць сваё ад чужого, просачыць у глыбі вякоў, як адбіваўся культурны ўплыў другіх народаў на беларускую культуру, яны стараюцца выявіць чыста твар свайго народу, і яго культурных здабыткоў.

Але трэба зазначыць, што і ў гэты час, як і раней, дасьледчая праца мае несыстэматычны, а выпадковы характар. Тады як некаторымі вучонымі зроблены паважныя дасьледаваньні па мове, этнографіі, гісторыі, праву,—ёсьць яшчэ цэлыя галіны навук, якія да гэтага часу зусім не закрануты. Вось унесьці сыстэматызацыю ў гэту працу й рэгуляваць яе можа толькі сталая установа, якою па сваім заданьням і зьяўляецца Інстытут Беларускай культуры.

Такім чынам, адна з асноўных задач Інстытута Беларускай культуры гэтае—дасьледаваньне па усіх галінах навукі, больш менш цесна зьвязаных з беларускай культурай, а разам

з тым і ідэёвае кіраваньне ўсімі навуковымі сіламі, якія працуюць на гэтай глебе. З гэтага боку Інбелкульт набліжаецца да тыпу тых дасьледчых інстытутаў, якія ў апошнія часы сталі закладвацца ў Расіі й на Украіне.

Але наш Інстытут посіць назву Інстытута Беларускай культуры і гэта назва абмяжоўвае круг яго дзейнасьці. Наш Інстытут павінен ня толькі тварыць беларускую культуру, ня толькі быць лябараторыяй гэтай культуры, а стаяць і на варце яе. З гэтага боку наш Інстытут ня можа замкнуцца ў сваіх кабінэтах і весьці толькі дасьледчую працу, але яму павінна быць дорага, і ён мусіць апякавацца аб кожнай беларускай справе. Адной з такіх галоўных спраў, бязумоўна, яўляецца ўтварэньне навуковай літаратуры на беларускай мове, а для гэтага перш за ўсё патрэбна навуковае апрацаваньне беларускай тэрміналёгіі і укладаньне падручнікаў для пачатковай і сярэдняй школы. Некаторыя могуць заўважыць, што укладаньне падручнікаў—гэта ня кампэтэнцыя навуковай інстытуцыі, якою зьяўляецца Інбелкульт, што дзеля гэтага мала патрэбна навуковасьці: аднак на такое запытаньне мы мусім адказаць, што даваць першы падручнік у беларускай мове можа куды трудней, чымся пісаць унівэрсытэцкі курс на рускай мове—пісаць першыя падручнікі па беларуску—гэта значыць працярэбліваць новыя шляхі. Апрача ўтварэньня навукі ў беларускай мове, Інбелкульт павінен рупіцца і аб ўсялякай іншай культурнай беларускай справе: усё роўна ці будзе гэта беларуская выдавецтва, ці школьная, ці тэатральная справа,—усё гэта, бязумоўна ня можа ня цікавіць Інстытут Беларускай культуры і павінна ўвайці у круг яго кампэтэнцыі. З гэтага боку Інбелкульт удзеляе шырокае месца культурна-грамадзянскаму жыцьцю, і вось гэта менавіта культурна - грамадзянская справа зьяўляецца другім абавязкам Інстытута Беларускай культуры.

Думка аб залажэньні Інстытута Беларускай культуры зарадзілася ў беларускім грамадзянстве ужо даўно. Блізка году таму назад на сходзе беларускага грамадзянства С. Некрашэвічам быў прачытаны на гэту тэму даклад. у рэзультаце якого была выбрана камісія для распрацаваньня статуту Інбелкульта. Апрацаваны гэтай камісіяй пад старшынствам З. Жылуновіча проэкт статуту Інбелкульта адводзіў толькі шырокае месца культурна-грамадзянскім пытаньням, надаючы, такім чынам, Інстытуту характар больш грамадзянскай, чымся навукова дасьледчай установы

Аднача́сна з працаваньнем камісіяй статуту ў Менску праўленьне Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту ў асобе яго рэктара В. Пічэты апрацавала ў Маскве статут Унбелкульт па тыпу дасьледчых інстытутаў. Каб не адчыняць двох навуковых інстытуцый, якія маглі весьці паралельную працу, прышлося гэтыя праэкты пагадзіць і апрацаваць адзін статут, які ў аснове сваей захаваў абодва прынцыпы—і навукова-дасьледчай установы і культурна-грамадзянскай.

Згодна свайму палажэньню, Інбелкульт падзяляецца на сэкцыі, а сэкцыі ў сваю чаргу на камісіі. Кожная сэкцыя яўляецца аўтаномнай адзінкай і самастойна вядзе працу па ўсім пытаньням, якія яе датыкаюцца. Прымаючы пад увагу запатта абмяжаванаміч супрацоўнікаў Інбелкульту, пры ім пакуль што заснованы толькі дзьве сэкцыі—народна—мова—знаўчая і прыродазнаўчая. Але з паляпшэньнем эканамічнага становішча Рэспублікі безумоўна штат Інбелкульта будзе павялічан і пры ім будуць заснованы новыя сэкцыі. Намечаны да адчыненьня гэткія сэкцыі: культурна-гістарычныя, грамадзянска-эканамічных навук, літэратуры й мастацтва.

Супрацоўнікі Інбелкульта падзяляюцца на ганаровых і сапраўдных членаў, навуковых супрацоўнікаў і членаў-карэспандэнтаў. Сапраўдныя члены і навуковыя супрацоўнікі займаюць штатныя пасады, а апошнія—няштатныя. Ганаровыя і сапраўдныя члены выбіраюцца з асоб, якія могуць кіраваць навуковай працай Інбелкульта і маюць асабліва вялікія заслугі перад беларускай культурай: ці гэта будуць заслугі навуковага зьместу, ці агульна-культурнага характару. Навуковыя супрацоўнікі выбіраюцца з асоб, якія выказалі асаблівую здольнасьць да на-

вуковай працы. Членамі-карэспандэнтамі Інбелкульта састаяць тыя асобы, якія сваімі карэспандэнцыямі ці іншаю працаю з месц дапамагаюць разьвіцьцю й замацаваньню Беларускай культуры.

У склад Інбелкульта назначены: старшынёй С. Некрашэвіч, сэкрэтаром У Чаржынскі, сапраўднымі членамі: Е. Карскі, І. Луцэвіч (Янка Купала), К. Міцкевіч (Якуб Колас) і Я. Лёсік; навуковымі супрацоўнікамі: М. Грамыка, А. Круталевіч, Ф. Бурак, В. Міхальскі, Ч. Родзевіч, М. Азбукін, М. Гуткоўскі, С. Плаўнік (З. Бядуля), М. Байкоў, М. Піотуховіч и Л. Більдзюкевіч.

У далейшым часе да памянёных працаўнікоў, бязумоўна, многа далучыцца яшчэ ганаровых і сапраўдных членах і членаў-карэспандэнтаў. Інбелкульт у першы чарод не вінен рупіцца аб тым, каб кадр яго членаў-карэспандэнтаў быў па мажлівасьці большы, каб да гэтых членоў карэспандэнтаў былі прыцягнены лепшыя культурныя працоўнікі зусей этнаграфічнай Беларусі і каб разам з тым члены-карэспандэнты былі жывымі нэрвамі, здольнымі адбіць і передаць усё культурная жыцьцё усіх нашых мясцовасьцяў.

Вышэй мы зазначылі, што Інбелкульт залажыўся на першы час у складзе двох сэкцый, народна—мовы—навучай і прыродазнаўчай. Як той, так і другой сэкцыі дасталася вялікая і няскончаная спадчына ад навукова-нэрмінолёгічнай камісіі. Гэтай камісіяй было прынята беларускіе 2.500 слоў—тэрмінаў і праэктавана 4.184 тэрмінаў. Дакончыць гэту пільную і вельмі патребную працу саставляе чарговую задачу Інбелкульта. Утвораныя пры абедзьвюх сэкцыях тэрмінолёгічныя камісіі робяць далейшы працяг працы і маюць на мэце поўнае апрацаваньне тэрміналёгіі па курсу сярэдняй школы і выданьне яе у бягучым годзе. Але праца Інбелкульту не абмяжоўваецца апрацаваньнем тэрміналёгіі. Пры народна-мовазнаўчай сэкцыі утворана слоўнікавая камісія, якая працуе над апрацаваньнем руска-беларускага слоўніка, і камісія па дасьледаваньню народнай тварчасьці, якая зараз апрацоўвае анкету для расшаўсюджваньня іх на Беларусі. Для тых жа самых мэт апрацаваны анкеты прыродазнаўчай сэкцыяй. Дзякуючы анкетам, Інбелкульт спадзяецца ўвайці ў зносіны з самымі глухімі куткамі Беларусі і атрымаць для сябе многа каштоўных матэр'ялаў. Гэтыя матэр'ялы будуць апрацоўвацца ў Інбелкульце і друкавацца у яго навуковай часопісі. Інбелкульт спадзяецца, што вясковая інтэлігенцыя—дактары, настаўнікі, аграномы не адмовяцца супрацоўнічаць у Інбелкульце і гэтым дапамагаць у яго вялікай працы.

У летку члены Інбелкульту рахтуюцца супольна з тутэйшымі навуковымі таварыствамі зрабіць некалькі навуковых экскурсый і гэтым ажыцьцівіць нашу дасьледчую працу, якая зусім спынілася у апошнія годы.

На агульных сходах Інбелкульта абгаварываюцца пытаньня агульна-культурнага зьместу, выдавецтва, школ і інш.

Члены Інбелкульта так сама працуюць на укладаньню і перакладу падручнікаў для беларускіх школ.

Гэтак на першых парах працуе Інбелкульт.

У далейшым праца яго бязумоўна пашырыцца. Першы крок да гэтага—выданьне навуковай часопісі, якая прымусіць кожнага члена Інбелкульта весьці больш інтэнсыўную працу і дзяліцца ёю з беларускім грамадзянствам. Прыходзіцца толькі пашкадаваць, што камісія па скарачэньню штатаў бязлітасна аднеслася да нашай галоўнай культурнай установы і пакінула так мала актыўных працаўнікоў. Нельга так сама ўспамянуць і аб тым, што члены Інбелькульта зусім не забяспечаны смешна сказаць, большасьць з іх атрымлівае па даваенным цэнам толькі па 1 руб. на месяц.

Але мы хочам верыць, што ўсё гэта часовае і ў далейшым Інбелкульт ня будзе пасынкам, якім ён яўляется да апошняго часу.

Треба берагчы і шанаваць нашу маладую установу, бо яна мозг і галоўны нэрв-кашага культурнага жыцьця.

С. Н.

Беларуская культурная праца на Усходзе.

Праца ў цэнтры—ў Маскве.

Адпавядая патрэбнасьці к адраджэньню, пашырэньню і ўзмацненьню Беларускае Культуры у межах этнаграфічнае Беларусі, якая яшчэ не далучана да галаўнага ядра дзяржаўнага арганізму Б.С.С.Р., пры Радзе на Асьвеце Нацыянальных Меньшынств у Маскве істнаваў у 1920 і першай палове 1921 г. Беларускі пададзел. Гэта быў перыяд рэвалюцыйнага перабудаваньня наогул ўсей Федерацыі, перыяд цяжкіх войн за самое яе істнаваньня. Весь чаму ня можна паказаць наглядных вынікаў культурнай працы Беларускага п'адзелу за гэты перыяд.

Больш поўная праца ў Цэнтры началася толькі з ліпеня 1921 г. калі Беларускі п'адзел быў пераарганізованы ў «Беларускае Цэнтральнае Бюро па Асьвеце» і на чале яго стаў сябра М. Лойка. Пры Бюро істнавала Калегія і Радакцыйная Камісія.

З важнейшых пастаноў Калегіі трэба адмеціць гэткія пастановы:

а) аб адкрыцьці ў Маскве клюбу для беларусаў студэнтаў;

б) аб арганізацыі радакцыйнай камісіі

в) зацьвержан плян па выдавецтву;

г) зацьверджан штаты Беларускіх адзелаў(сэкцый)у Ўсерасейскім маштабу;

д) зацьверджаны праэкт выданьня палітыка-літаратурнага часопісу на беларускай мове, з погляду адсутнасьці такога на тэрыторыі Р.С.Ф.С.Р. (не беручы пад увагу Б.С.С.Р.).

Редакцыйная Калегия выпаўніла наступнае:

а) пакіравала праз адпаведныя інстанцыі да надрукаваньня ў ліку 35.000 адбіткаў таблiцу метрычных мер на беларускай мове, а так сама послана для друку ў ліку 50.000 адбіткаў 1-ая і 2-ая кніга для чытаньня «Родны Край» Гарэцкай;

б) разпрацавала і правадзіць праз адпаведные інстанцыі сьмету на выданьне кніг (падручнікаў і педагагічнай літаратуры) на 1922 г. агульным лікам па Глаўсацвосу 36 назваў, 489 друкаваных аркушаў, 8.190.000 аркушаў паперы 920.000 сшыткаў і па Глаўпрафобру—38 назваў, 2.462.000 аркушаў папэры, 323.000 сшыткаў.

в) распрацавала і падала на зацьвярджэньне праэкт выданьня штотыднёвага палітыка-літаратурнага часапісу ў 4 друкованые аркушы, 5.000 сшыткаў, 1.040.000 аркушаў памеры;

г) устанавіла сувязь з Дзяржаўным Выдавецтвам Беларусі і заручылася яго згодаю, праз Наркомасьветы Беларусі, аб надасланьні 20% выпушчаямой літаратуры ў 1921 г.

Цэбюро распрацавала і зацьвердзіла штаты Беларускіх Адзелаў (сэкцый) у Ўсерасейскам маштабу на 141 чалавек але штаты былі скарочаны і выявіліся ў гэткім відзе: на Гомельшчыне—15 ч., на Віцябшчыне—12, і на Смаленьшчыне —5 чал.

За часы 1921 г. часткова пад уплывам недаўна скончыўшайся вайны, часткова з прычыны адсутнасьці досыць моцнага Цэнтральнага Беларускага воргана, беларускіх зьездаў і канфэрэнцый на Ўсходняй Беларусі не было. Дзеля развязаньня цэлага шэрага хворых пытаньняў, а так сама, наогул, дзеля разьвіцьця да найбольшасьці працы сярод Беларусаў, Цэбюро разпрацавала на 1922 г. ніжэйшы праэкт зьездаў і беларускіх канфэрэнцый, які павінен быць зацьверджаны Радаю Кам. Меньш.

№№ па парадку.	Якога рода зьезд альбо канфэрэнцыя.	Мейсца зьезду.	Час.	Лік сяброў на зьезде.
1	Губ канфэр. Бел-сэкцый	Гомель	Сакав. Трав.	35
2	"	Віцебск	—	30
3	"	Смаленск	—	25
4	Районы зьезд працоўнікаў Асьветы беларусаў	Полацк	Трав. Ліпень	100
5	"	Лепель	—	75
6	"	Невель	—	75
7	"	Орша	—	75
8	"	Магілеў	—	125
9	"	Горкі	—	75
10	"	Рагачоў	—	75
11	"	Мсціслаў	—	125
12	Абласны зьезд Беладзелаў і прадстаўнікаў Асьветы Беларусі	Менск альбо Віцебск	Ліпень	80

За паказаны час (1920—1921 г.) на Усходняй беларускай тэрыторыі па вышэйшым прычыпам не было ні водных чыста беларускіх курсаў для падгатоўкі настаўніцкага персаналу.

Дзеля адсуненьня гэткага ненармальнага зьявішча, а так сама групуючыся на вялікім ліку заяў з мест, якія выявілі жаданьня аб патрэбе пераводу у 1922—1923 г. выкладаньня ў школах на беларускую мову (напр., Пастанова Губэрскага зьезду працоўнікоў асьветы Гомельшчыны у чэрвяню 1921 г.) Цэбюро правяло праз Бюра Нацменьш Главсацвоса праэкт па арганізацыі вышэйшых курсаў. Гэты праэкт зацьверджаны хаця і ў скарачаным відзе але з абавязковаю умоваю, каб на агульных курсах, якіе арганізоўваюцца Павятовымі Адд. Асьветы на мейсцох выкладаліся пытаньня беларусазнаўства (Гісторыя Беларусі, Гісторыя Беларускае Літаратуры, Геаграфіі Беларусі). Аплата лектароў павінна быц аднесяна на сьродкі з смет Пав. Адз. Асьветы.

Вось якія зацьверджаны тымчасовые беларускіе курсы:

№№ па парадку.	Назва курсаў.	Пачатак.	Працягненьне курсаў.	Мейсца.	Лік слухачоў.
1	Дашкольн. пр.	1/III	6 м.	Вітабск	100
2	Школьн. пр.	1/V	3	"	50
3	Дашкольн. пр.	1/III	6	Смаленск	100
4	Школьн. пр.	1/V	3	"	150
5	Дашкольн. пр.	1/III	6	Гомель	100
6	Школьн. пр.	1/V	3	"	60
7	—	1/V	3	Магілеў	90

Вельмі дрэнна стаяла справа з беларускаю літаратураю. У часы 1921 г. трэба сказаць на тэрыторыі Р.С.Ф.С.Р. (апрача Б.С.С.Р.) на беларускай мове не выдадзена ні воднай кніжкі.

Зраней выдрукаваных на кніжным складзе пры Цэнтрадруку меліся кнігі:

№№ па парадку.	Назва кніг.	Аўтар.	Год выданьня.	Лік сшыткаў.
1	Курс Белоруссоведения . .	Сборник лекций	1918-1920	594
2	Истор. Нов. Белорусск. Лит. .	Янчука	1920	675
3	Сборник стихотворен. .	Я. Купала	1919	731
4	Сборник „Зажинки" . .		1918	319
5	Карта Белор. племени . .	Карский	1918	2000
6	Што такое Сав. Ўлада . . .	Карпика	1919	2000

Апроч гэтых пры Цэнтральным Беларускім Бюро меліся кнігі:

№№ па парадку.	Назва кніг.	Аўтар.	Год выданьня.	Лік сшыткаў.
1	Основные моменты истории Белоруссии. .	Любавский	1918	400
2	Белорусская речь	Ак. Карский	—	25
3	Конституция Р.С.Ф.С.Р. на бебелорусск.языке.	—	—	100
4	„Павукі і Мухі".	Лібкнехт	—	100

З давядзяных вышэй табліцаў ясна відаць, якімі нікчэмнымі запасамі ўладала Цэбюро і з якімі слабымі матар'яламі яно арудавала.

Вялікая недастача ў гэтым кірунку была пополнена Наркоматам Асьветы Беларусі, які за свой страх и рызыку пакіраваў у Гомельшчыну і Вітабшчыну школьнай літаратуры каштоўнасьцю больш за 100.000.000 р.

Трэба спадзявацца, што да пачатку вучэбнага году ў 1922 г. пры дапамозе выдавецтваў пры Р.С.Ф.С.Р. і ў Менску, а так сама праз закупку кніг, якія выдаюцца Беларускаю школьнаю радаю у Літве, удасца пабыць нейкі лік патрэбных падручнікаў і літаратурны і гэтым здаволіць гаручае пажаданьне мейсц Усходняй Беларусі аб адчыненьні Беларускіх школ.

Культурная праца сярод беларусаў ў Маскве глаўным чынам кіруецца прадстаўніцтвам Наркомасьветы Беларускае Рэспублікі.

Больш ўсяго захопляны культурнаю беларускаю справаю студэнты беларусы. У 1921 г. існавалі ў Маскве тэткія студэнтскія хаўрусы:

1) «Беларуская Нацыянальная Асацыяцыя» пры Пятроўскай Сельска-Гаспадарчай Акадэміі, з 135 чалавек.

2) «Беларускі Гурток» пры Межавым Інстытуце з 45 чалавек.

3) «Беларускі Гурток» пры Камуністычным Унівэрсытэце Свердлова—з 40 чалавек.

4) «Беларускі Гурток» пры Акадэміі Сацыяльнага Выхаваньня ў 50 чалавек.

Апрача гэтых пры Вышэйшым Літаратурна-Мастацкім Інстытуце зложылася ініцыатыўная група студэнтаў-беларусаў, якая робіц крокі да адчыненьня ў Маскве «Беларускага Літаратурна-Мастацкага Гуртка».

Паказаные беларускіе хаўрусы ставяць мэтаю усебаковае ізучэньня беларускай тэрыторыі. Для даданьня гэтай мажлівасьці ўсім беларусам-жыхарам Масквы, Цэбюро вынясло пастанову аб адчыненьні ў Маскве беларускага клюбу.

Трэба зьвярнуць асабліваю ўвагу на адчыняную ў Маскве ў палове 1921 г. па ініцыатыве Наркомасьветы Беларусі —Беларускую Опэрна - Драматычную Студыю. У складзе студзійцаў ёсьць ураджэнцы як Беларускай Рэспублікі так і Беларускай тэрыторыі ў межах Р.С.Ф.С.Р.

Кірують іх заняцьцямі знатнейшые артысты Маскоўскіх Дзяржаўных Тэатраў (Мастацкага, Малага, Корша). Напэўна можна спадзевацца, што праз некалькі часу Беларускае Тэатральнае Мастацтва атрымае новае кіраўніцтва праз маладые сілы высока кваліфіцыйных артыстаў.

У 1918 г. у Маскве было больш як 20 дзіцячых дамоў (прытулкаў), у якіх жылі і вучыліся выключна беларусы-бежэнцы. Лічылася іх каля 500 чалавек. Але ў працягу 1919—1920 г.г. гэтые дамы ці злучаліся, ці проста касаваліся і дзеці распыляліся па небеларускім прытулкам.

II. Праца на мейсцох.

Гомельшчына.

На Гомельшчыне Беларусаў жыве 80—90%. Гэтым тлумачыцца тое, што Губэрніальны зьезд працаўнікоў Асьветы у жніўеню 1921 г. пастанавіў з 1922—23 вучебнага году увясьці выкладаньне па беларускай мове ва ўсіх школах. Да арганізацыі беларускага адзелу ў Гомельшчыне прыступілі яшчэ у красавіку 1921 г., але дзякуючы пераконам русіфікатарскіх элементаў справа наладзіць работу зацягнулася да месяца лістапада.

Вось як піша Цебюро 17/х—21 г. за № 67 да Рады Нац. Меньш. Н.К.А. «27 травеня 1921 г. пры ўдзеле інструктара Цебюро з Шыповай ў гор. Гомелі арганізованы сход Беларусаў пастанавіў у развіцьцё інструкцыі Наркомасьветы адчыніць пры Губоно Беларускі Адзел паралельна з істнуючым польскім і жыдоўскім. Не гледзячы на тое, што Гомельскую губэрнію насяляюць чуць што не адны беларусы, не зьвярнута ўвага на пратакол вышэйпамянутага сходу ад 27/v-21 г. Губано не знайшоў патрэбным арганізаваць Бел. Адзел 22/vii-21 г. т. е. пасьля 2-х месяцоў са дню арганізацыі беларусаў у Гомелі. Рада Нац. Меньш. паслала за № 4076/19 прапазыцыю Губоно па таму самаму пытаньню, 9/ix за № 5276/29 запытаньне па № 4076, 22/ix ізноў запытаньне за № 5497/42 па № 5276 і на ўсе гэта Гобоно не знайшоў потрэбным даць адпаведзь. З даложанай выпіскі пратаколу пасяджэньня Калегіі Цебюро ад 1/х-21 г. можна ўбачыць, што Беларускі Адзел пры Гомельскім Губоно не арганізваны да гэтага часу па уплыньню 4-х месячнага тэрміну. І гэта пры істнаваньні ў межах губэрні павятова-гарацкой Беларускай сэкцыі, Беларускага хаўруса пры Гары-Гарэцкім Сел.-Гасп. Інстытуце, Беларускіх Колках ў гарадох і мястэчках. З погляда гэтага прыходзіцца сумлевацца, што катэгарычнае вымаганьне Рады Нац. Мен. якое послана 10/х за № 5793 і 5794 дасягне сваей мэты».

Усе-ж такі не гледзячы на такія

перашкоды на Гомельшчыне арганізаваны вось якія беларускія установы: 1) Гомельская губэрніяльная сэкцыя, 2) Гомельская павятова-гарацкая сэкцыя, 3) Магілеўская павятова-гарацкая сэкцыя. Апроч гэтых прыступлена да арганізацыі белсэкцыі ў г. Рэчыцы.

Усеж такі на беларускай справе на Гомельшчыне зроблена за 1921 г. наступнае:

1) Гомельскі педаг. тэхнікум увеў у курс выкладаньня Беларусазнаўства.

2) Уведзен курс Беларусазнаўства ва многіх школах II ступені (пэўных цыфраў няма).

3) Функцыянуе шмат школ I ступені з выкладаньнем на беларускай мове.

4) У Гомелі ісьць беларускі хор і трупа.

5) У Магілеве хор у складзе 40 асоб і артыстычная трупа ў складзе 20 асоб.

6) Амаль што ў кожным павятовым горадзе і мястэчку маюцца хоры і гурткі па ізучэньню беларускага пытаньня.

7) Блізка Гомелю ў с. Прасна, школьнымі працоўнікамі заложаны навуковы беларускі гурток.

Нармальнаму развіцьцю працы ў 1921 г. перашкаджала па першаму позьняя арганізацыя, адсутнасьць грашовых сьродкоў, а асабліва неразуменьне мейсцовымі адпаведнымі працоўнікамі усей важнасьці беларускага пытаньня. Нічым інакшым, як гэтым, можна тлумачыць тое, што за аддачу памяшчэньня для выступленьня беларускае трупы альбо хору, Магілеўскі Палітпрасьвет вымагаў платы значных сумаў, аслабаняя ад іх расейскія трупы.

Вітэбшчына.

Вітэбская Беларуская Губэрніяльная Сэкцыя была арганізавана 29/х 21 г., а Полацкая—3/хі 21 г. З погляду гэтага нельга многа сказаць а пастаноўце справы асьветы сярод беларусаў Вітабшчыны. Але ў Вітабску і у Полацку жыве пакалькі вядомых беларускіх дзеячоў, якіе значна падтрымоўваюць беларускі культурны рух. Пад іх уплывам у гэтых гарадох і ў другіх павятовых гарадох функцыянуюць тэатры і хоры. У Полацку, напрыклад, выступае дзіцячая трупа якая ставіць пьесы, напісаныя раней, а так сама напісаныя жывушчым ў Полацку вядомым беларускім пісьменнікам А. Пшчолкаю. Вынікі культурнае працы чакаюцца ў будучым часе.

Патрэбна адмеціць, што наогул становішча школьнае справы на Вітабшчыне выдзеляецца з шэрага другіх. Па афіцыяльнаму адчоту, школьных працоўнікаў у летку 1921 г. там было 15% агульнага ліку і то палавіна непадгатаваных; 40 настаўнікаў нанялося ў пастухі; 11 скончылі самазабіўствам; некалькі пайшло ў бандыты. Гэтых жалобных фактаў не прышлося-б давадзіць, калі-б яны ня мелі самае блізкае датычнасьці да асьветы беларусаў.

Досыць паказальны, па афіцыяльным ведамасьцям, факт к характарыстыцэ прадстаўнікам Асьветы. Стаячы на чале Губано Вітабск с. Храпкоўскі адмовіў прадстаўніку Цэбюро с. Шышовай, што ў Вітабскай губэрні няма ні воднага беларуса, што адзел арганізаваць ён не дазволіць, што пэнсыі супрацоўнікам ён выпісваць не будзе.

Смаленшчына.

З погляду адсутнасьці цэнтральнага апарату, у Смаленшчыне беларускіе адзелы не арганізаваны, але ў вамногіх мейсцах функцыянуюць хоры, гурткі й тэатральные трупы аматароў.

Адэса.

Для параўнаньня адносін Масквоўцаў на Гомельшчыне й на Вітэбшчыне за беларускае справы мы прыводзім выпіску з афіцыйнага адчоту а беларускай справе украінцаў, якія калісь самі былі нацыянальна-прыгнечаны і спачываюць свайму брату беларусу.

«Беларуская калёнія ў Адэсі налічвае больш як 20.000 чалавек, з якіх ⅔—бежэнцы імпэрыялістычнай вайны з района Гродненскай і Менскай губэрні. Працаю сярод іх кіруе Беларуская сэкцыя пры Адэскім Губкоме Р. К. П. Праца гэта, падзеляецца на 2 часьці: палітычную і культурна-асьветную. Дзеля разтлумачэньня беларускім працоўным масам ідэй камунізму і азнаямленьня з бягучаю Савецкаю палітыкаю. Беларуская сэкцыя арганізоўвае цэлы шэраг лекцый і бясед.

Пры Беларускім рабочым Клюбе засноўван гурток палітычнай граматы. Вялізная палітычная праца вядзецца сярод моладзі. У беларускіх школах плянова й сыстэматычна наладжваюцца лекцыі й праводзяцца размовы па палітычныя тэмы. У Адэсі маюцца ніжэйшыя беларускія установы: Беларускі Рабочы Клюб, Беларуская сэкцыя пры Губоно й 6 школ, з якіх 2 школы камуны. Па правядзеньню ў іх прынцыпаў едзінай працоўнай школы лічацца абразцовымі. Пры адной з гэтых школ заложан гурток камуністычнай моладзі, дзіцячы тэатр і хор. У школах вучыцца больш 400 дзяцей. Выкладаньне вядзецца па беларускай мове. Пры беларускім рабочым клюбе маецца гістарычна-літаратурны гурток хор і трупа артыстаў. Праца ў беларускай сэкцыі не абмежаўваецца толькі адною Адэсаю. З раёнаў Адэскай і Мікалаеўскай губэрній часта прыежаюць у Адэсу бежэнцы беларусы за спраўкамі, газэтамі й літаратураю, чым па сіле мажлівасьці забезпечваюцца».

Мы бачым, што на Ўсходзе Беларусі справа беларуская пашыраецца й патрабуе больш арганізацыйных культурных сіл, бачым, што беларускі рух на сваім шляху спатыкае й перашкады, асабліва ў апошніе часы нампішуць і кажуць, што становішча беларускае справы з 1921-га году значна пагоршалася.

Так у Гомелі ў студзені 22 г. была зачынена Беларуская сэкцыя, бышцам па адсутнасьці штатаў, тагды як Масква зацьвердзіла ў свой час толькі на губерніяльную сэкцыю 4 чалавекі беларусаў.

Так сама нязьмерная варажасьць Вітабскіх дзеячаў да беларускае справы зрабіла тое, што нават і камуністы беларусы зьявіліся, ці адкамандыраванымі ў ПУР, ці разасланымі на губэрніі. Па гэтаму становішчу на Вітабшчыне Рада Нацыянальных Меньшасьцяў пры Калегіі Наркомасьветы зрабіла 15/ııı—22 г. пастанову: «Паказаць на: 1) Неабходнасьць арганізацыі Рады (Совнацмена і 2) Воргана дзеля вядзеньня асьветнай працы сярод беларусаў на беларускай мове.

Беларуская грамадзянства павінна прыглядывацца к становішчу беларускае справы па Ўсходзе, каб ў свой час узмацніць пашырэньне беларускае нацыянальнай ідэі й даць адпор яе супраціўнікам.

Н. Г—скі.

Беларуская культурная праца у Заходняй Беларусі.

Кіраўвічым асяродкам беларускае культурнае працы ў Заходняй Беларусі зьяўляецца г. Вільня. Тутака згуртавалася найбольш беларускіх культурных сіл, тутака асталяваліся найвялікшыя беларускія культурна-нацыянальныя арганізацыі, адгэтуль распаўсюджваецца беларускі пэрыядычны і непэрыядычны друк. Адным словам, Вільня—гэта сэрца і мозг культурна-адраджэнцкае працы беларусінаў у Заходняй Беларусі.

Двама, галоўным чынам, шляхамі вядзецца гэтая праца: праз беларускую школу і праз беларускае друкаванае слова. Пашырэньне беларускае школы і беларускага друку—вось пад якімі лёзунгамі вялася й вядзецца ў апошнія гады там культурная праца.

Беларуская школа у Віленшчыне і Горадзеншчыне распачала сваё істнаваньне ў часы нямецкай там акупацыі. І трэба сказаць праўду, што якраз у тыя часы, г. зн. 1915—1918 гг., яна дасягнула найвышэйшага пункту свайго росквіту. Нямецкія акупанты, у чыіх інтарэсах было не допускаць, каб польская нацыя узмацнялася коштам Заходняй Беларусі,—стрымлівалі апэтыты і полёнізацыйную працу польскіх імпэрыялістычных колаў. Наадварот, немцы - акупанты даволі прыхільна пазіралі на беларускую школу, і калі не давалі ёй больш-менш значнай ад-

намогі, то і не перашкаджалі яе разьвіцьцю. А гэтага ўжо выстарчала, каб беларуская школа красавалася і пашыралася.

Нямецкая акупацыя зьмянілася з поўнымі перапынкамі новай акупацыяй —польскай. Нічым ня стрымліваная хваля полёнізацыі нахлынула і пракацілася праз Заходнюю Беларусь. Нахлынула і пракацілася, але не патрапіла заліць оазісаў нашае культурна-адраджэнцкае працы—беларускае школы. Нягледзячы на гвалтоўныя напасьці, не перастала істнаваць беларуская школа, —а наадварот, манілася нават пашыраць межы сваёй чыннасьці. І вось у гэты бок, у бок змаганьня за істнаваньне і пашырэньне беларускае школы, было найбольш накіравана дзейных беларускіх культурных сіл.

Якіх-жа скуткаў дасягнула гэтае змаганьне? Вялізарных. Ня ў тым сэньсе, што лік беларускіх школ шмат павялічыўся. Полёнізацыйная палітыка мясцовых уладаў такімі ўмовамі і перашкодамі абставіла адчыненьне кожнае новае беларускае школы, а з другога боку—гэтак старанна вышуквае якіх-колечы прычапак, абы толькі зачыніць тую ці іншую ненавісную беларускую школу, што ня надта можа разьвівацца і пашырацца там лікам гэтая школа.

Але затое яна пашыраецца іншым шляхам:—ідэёва. Калі нам прыходзіцца казаць аб ліку беларускіх школ у Віленшчыне і Горадзеншчыне, то мусімо прызнацца, што гэты лік даволі абмяжованы. Праўда, што няма бадай такой воласьці, дзе б не спатыкалася адна, а то й некалькі беларускіх школ, але ўсё гэта ў параўнаньні з запатрабаваньнямі толькі нязначная доля. Па падлічэньню Беларускай Школьнай Рады ў Віленшчыне і Горадзеншчыне на 1921—22 гг. мела істнаваць больш як паўтараста пачатковых беларускіх школаў, некалькі гімназіяў, настаўніцкіх курсаў і інш. Але і гэты лік значна скараціўся ў апошнія часы, дзякуючы прычынам, аб якіх будзе ўспамінацца ніжэй.

Аднак, ня гледзячы на гэтак абмяжованы лік, ідэёва беларуская школа на нашым Захадзе прыняла масавы характар і, магчыма, што ў найхутчэйшым часе выльецца ў нічым нястрыманую стыхійную сілу. Ідэя аб неабходнасьці беларускае школы гэтак глыбока запала ў беларускі грунт, гэтак моцна зраслася з імкненьнямі нашых сялян, што ўжо бадай мала знайдзецца ў Віленшчыне і Горадзеншчыне такіх вёсак і валасьцёў, якія-б не рабілі стараньняў у кірунку адчыненьня беларускіх школ, якія б ня выносілі на сваіх сялянскіх і валасных сходах пастановаў, ня пісалі просьбаў аб гэтым адчыненьні. Праўда, найчасьцей на ўсе гэтыя стараньні атрымліваўся і атрымліваецца лаконічны адказ: **nie pozwaliam**. Але беларускае сьвядомае грамадзянства не апускае рук, пішуцца паўторныя просьбы, паўторныя склікаюцца сходы, пасылаюцца дэлягацыі ў цэнтры, і не на хвіліну не мае польскае панства супакою ад прыхільнікаў і пашыральнікаў беларускае школы. У гэтым кірунку волю нашага селяніна можна лічыць нязломнай, бо ён ня лёгка адмаўляецца ад раз запаўшай у яго голаву думкі. Аб гэтым можа сьведчыць наступны вельмі характэрны і цікавы кавалак з карэспандэнцыі з м. Лаварышкі, Віленскага пав., зьмешчанай у віленскай газ. «Беларускія Ведамасьці»:

«...Але мы ўсё ж ня думаем цішшком злажыўшы рукі сядзець, мы будзем слаць прашэньне за прашэньнем, дэлягацыю за дэлягацыяй, а свайго даб'ёмся, даб'ёмся права для свае роднае мовы і ў касьцёле і ў школе і ўсюды, дзе толькі жывець наш сярмяжны беларускі народ.

Нашая родная простая мужыцкая мова мусіць стаяць нараўне з польскай бо яна нам такая самая добрая і харошая і над жыцьцё даражэйшая»...

Весь характэрны голас беларускага сялянства, вось яго погляд на адраджэньне беларускае культуры, на адраджэньне беларускае школы. Праўда, што польскія ўлады часта затыкаюць вушы, каб ня чуць такіх галасоў, і заплюшчваюць вочы, каб ня бачыць, як хваля адраджэньня беларускага народу падымаецца ўсё вышэй і вышэй, і вось-вось пагражае зьмясьці з твару зямлі беларускай катаў-чужынцаў. І заткнуўшы вушы і заплюшчыўшы вочы, польскае панства направа і налева размахвае бізуном,

пагражае стрэльбай і вастрогам тым, хто адважваецца да яго зьвяртацца аб адчыненьні беларускай школы.

У адказ на просьбу аб адчыненьні новай беларускай школы, зачыняюцца ўжо істнуючыя; а калі пад бязупынным націскам прыходзіцца даць дазваленьне на гэтую школу, то назначаецца ў ёй настаўнік—паляк, які зусім ня ведае беларускае мовы. Гэтак, напрыклад, у м. Крынках, Горадзенскае губ. і павету беларуская школа на 6-ым годзе свайго істнаваньня была зачынена польскаю ўладаю. Але жыхары моцна не давалі супакою павятоваму інспэктару. Аж нарэшце ён запрапанаваў, каб дзеці беларускія, якія жадаюць вучыцца пабеларуску, ішлі запісвацца да «**kierownika szkół powszechnych**» (кіраўніка людовых школаў), і калі запішацца ня меней, як 60 вучняў, будзе зноў істнаваць беларуская школа з беларускім настаўнікам. Дзяцей запісалася 120 і павятовы інспэктар прыслаў «беларускую» настаўніцу, чыстую варшавянку. Цяпер ідзе навука ў беларускай школе з польскаю выкладоваю мовай беларуская мова—як прадмет, па аднэй гадзіне ў дзень адсунута на 4 лекцыю. *На лекцыях беларускае мовы варшавянка говорыць памаскоўску.*

У воласьці Гальшанах, Ашмянскага павету ў 1920/21 г. было 6 беларускіх школ, з якіх сёлета зачынілі 4, а на іх месца пазакладалі польскія. Сялянства заявіла пратэст проціў гэтага гвалту і сьвядома байкатуе польскую школу, не пасылае туды сваіх дзяцей, а дамагаюцца, каб зноў былі адчынены беларускія школы.

Бываюць і такія выпадкі, калі сяляне просяць, каб ім дазволілі адчыніць беларускую школу, якая будзе ўтрымлівацца ня коштам ураду, а іх уласным, сялянскім. І гэта ня гледзячы на тое, што з іх ужо сабралі дзяржаўныя падаткі на школы, дзякуючы чаму ўсе польскія школы ўтрымліваюцца дзяржаваю.

Як мы бачым, у сфэру змаганьня за беларускую школу ўцягнены самыя вялізныя грамады беларускага сялянства ў Віленшчыне і Горадзеншчыне. Дзякуючы гэтаму беларуская школа, паўтараем, на нашым Захадзе носіць на сабе масавы характар. І калі лікам яна ў апошнія часы часта нават меншае, то ідэёва яна бязупынку пашыраецца і ўзмацняецца.

Другім шляхам, якім вядзецца беларуская культурная праца на нашым Захадзе, як мы ўжо вышэй адзначылі, —зьяўляецца пашырэньне беларускага друкаванага слова.

Беларускія выдавецтвы істнуюць ня толькі ў Вільні, але і ў Нямеччыне, і ў Літве. Галоўным іх заданьнем зьяўляецца выданьне падручнікаў для пачатковае і сярэдняе беларускае школы. У гэтай працы на першым месцы зноў стаіць Вільня. Тутака выдана найбольш. З паміж гэткіх выданьняў за апошні год трэба адзначыць дзьве часткі альгебры Кісялёва, пераклад А. Луцэвіча, карты - паўкулі, правапіс Станкевіча трэцяе выданьне граматыкі Тарашкевіча, хрэстаматыю «Родны Край» Л. Гарэцкай, гісторыю беларускай літэратуры Гарэцкага, другое выданьне «Гісторыі Беларусі»—Ігнатоўскага і шм. інш.

З паміж пэрыадычных выданьняў у Вільні выходзяць: Тыднёвы часопіс «Беларускі Звон», штадзенны—«Еднасьць», і тыднёвы—«Раніца». Да самага нядаўняга часу выходзіў яшчэ тыднёвы часопіс «Беларускія Ведамасьці»,—які зачыніўся польскімі ўладамі ў зьвязку з адчыненьнем Віленскага сойму. Гэтак сама ў канцы 1921 г. быў зачынены тыднёвы часопіс каталіцкага беларускага духавенства «Крыніца». З паміж пералічаных часопісаў «Беларускія ведамасьці» найбольш гуртавалі вакол сябе беларускіх культурных сілаў, вялі найбольш чыннае змаганьне за правы беларускае культуры. Спаткаў іх лёс, якога трэ' было й спадзявацца. У меншай меры выяўляе сабой беларускую думку, настроі і імкненьні часопіс «Беларускі Звон». Што-ж датыча «Еднасьці» і «Раніцы»—то гэта органы вядомага Аляксюка, якія стаяць на грунце аховы правоў і інтарэсаў не беларускага народу, а польскіх абшарнікаў. «Крыніца»—зьяўлялася даволі парадачным і дэмакратычным органам беларускага каталіцкага духавенства.

З паміж беларускіх культурных арганізацыяў, якія знаходзяцца ў Вільні, трэба адзначыць: Школьную Раду, Бі-

ленскі Беларускі Муз.-Драматычны гурток, Беларускае выдавецкае т-ва. Арганізацыю беларускіх студэнтаў пры Віленскім Унівэрсытэце, якая налічвае больш 60 асоб. і інш.

Нельга замаўчаць і аб тэй культурнай беларускай працы, якая праводзіцца ў Латвіі. Тутака кіруе ўсёй беларускай працай гэтак званае «Беларускае Культурна-Прасьветнае Т-ва «Бацькаўшчына». Пачатковых беларускіх школ у Латвіі налічваецца каля паўсотні. Маецца некалькі музыкальна-драматычных гурткоў, а ў Дзьвінску нават працуе сталая трупа беларускіх артыстаў, якая субсыдыруецца латвійскім урадам. Наогул аб мажлівасьці культурнае працы ў Летгаліі вось што пісалі ў свой час «Беларускія Ведамасьці»:

«У Летгаліі. часьці Латышскай рэспублікі. істнаваньне нашай школы, можна сказаць, залежыць толькі ад самых беларусаў. бо латыскі ўрад адносіцца надта прыхільна да разьвіцьця беларускае культуры. Праўда, што там цяпер беларусы шмат чаго зрабілі і робяць...».

Вось больш-менш агульны агляд нашае культурнае працы за рубяжом. Як мы раней пераканаліся, гэтая праца ні на хвіліну ня спыняецца і ўсё коціцца наперад. Найцяжэй працаваць пад польскай уладаю. Адчуваецца гэта асабліва ў апошнія месяцы, пасьля таго, як адбыліся выбары ў Віленскі сойм. Да выбараў яшчэ было сяк-так. Польскія ўлады баяліся надта дражніць беларускае грамадзянства, спадзяючыся, што гэтым яны нас прыцягнуць на свой бок у часе выбараў. Але як толькі пабачылі, што беларускія колы ад самага пачатку выбараў занялі найбольш варожае да палякаў становішча, як пабачылі, што беларускае сялянства пад уплывам пэўнае агітацыі і нацыянальнага ўсьведамленьня байкатуе выбары, у гэты момант палякі паказалі свой запраўдны твар, разграміўшы частку беларускіх арганізацыяў і выслаўшы некаторых беларускіх дзеячоў з межаў гэтак званае Сярэдняе Літвы. Пасьля гэтай буры, беларуская культурная праца яшчэ больш стала цяжкай. Але ня спынілася і ня думае спыняцца. Наадварот, беларускія культурныя працоўнікі цясьней толькі злучаюць свае рады і яшчэ бош упарта ідуць да сваёй мэты.

Дз-і.

Беларускі Аддзел Наркамасьветы Беларусі.

(Кароткі агляд працы).

Праца Бел. Аддзелу НКА можа быць падразьдзелена гэтакім чынам:

1) Агульнае кіраўніцтва працай па адраджэньню і пашырэньню белар. культуры.

2) Падгатоўка кадра кваліфіцырованых працоўнікаў для беларускіх культурна-асьветных установаў.

3) Заходы аб тэхнічным выданьні беларускіх падручнікаў, навуковых падсобн. і літаратуры; а так сама разьмяркаваньня іх паміж бел. школамі і іншымі культурна-асьветнымі ўстановамі і распаўсюджваньня бел. літаратуры паміж тых беларускіх культурна-асьветных устаноў, якія знаходзяцца на абшарах Р. С. Ф. С. Р. і іншых фэдэратыўных рэспублік.

Вядучы сваю працу ў установах НКА, якія знайходзяцца ў м. Менску, Беларускі Аддзел усё-ж такі лічыць, што галоўная праца яго—праца ў паветах, праца на вёсцы. Каб мець магчымасьць кіраваць гэтай працай у паветах і па вёсцы, Беларускім аддзелам былі арганізованы беларускія павятовыя п/аддзелы, якія будучы падлеглымі з аднаго боку, адміністрацыйнага і гаспадарчага пав. Аддзелам, з боку ідэйнага кіраўніцтва падлегаюць выключна Бел. Аддзелу НКА. Гэтакім чынам па сваей структуры быў зарганізованы беларускі п/аддзел і пры месным гарацкім Аддзеле Нар. Асьветы, якому было даручана вядзеньне беларускай культурна-асьветнай пра-

цы ў установах м. Менску. З самага пачатку праца гэтых п/аддзелаў на паветах была не зусім здавальняючай, бо кіраўнікамі іх былі асобы не вытрывалые, асобы якія не змаглі разам пярамагчы тую апазыцыю, якая была з боку адпаведных працоўнікаў і кіраўнікоў П. А. Н. А. супроць маладой, беларускай пралетарска-сялянскай культуры, адраджэньня якой знайходзіцца яшчэ толькі ў пачатковых формах. Гэта апазыцыя не ізжыта яшчэ й да гэтага часу, хоць і зьменшылася пасьля тэзісаў Сталіна па нацыянальнаму пытаньню, прынятых 10 конф. РКП и тэзысаў па бел. нац. пытаньню, надрукованых у «Известиях ЦВ КПБ.»

Ня гледзячы на ўвесь цяжар працы, ўсёж такі на паветах зроблена многа уведзена беларуская мова як прадмет у ва ўсіх першых групах школаў, каля 20% усіх школаў вядуць навучэньня выключна на беларускай мове, перайшлі на беларускую мову і ўсе дзіцячыя установы, якія ўкомплектованы дзецьмі беларусамі (дзіцячыя дамы, сады і г. д.). Пры скарачэньні штатаў у школах праведзен прынцып укамплектаваньня беларускіх школаў у першую чаргу тымі настаўнікамі, якія добра ведаюць беларускую мову і спачуваюць беларускаму культурна-нацыянальнаму адраджэньню. За апошні час інтэнсіўнасьць працы беларускіх павятовых п/аддзелаў зьменшылася ў зьвязку з зьменай штатаў. Па гэтым штатам беларускія п/аддзелы скасаваны і ўведзены інструктары беларускай культуры.

Гэтая ломка ўнесла дэзарганізацыю ў працу бел. павятовых п/аддзелаў, з прычыны таго што асоба інструктараў гэтых новых штатах не зусім выяўляна, як ня выяўляны і яго абавязкі. Беларускі аддзел лічыць гэтую зьмену вельмі шкоднай для свае працы на вёсцы і ў калегіі НКА будзе дабівацца аб захаваньні павятовых беларускіх п/аддзелаў.

Дзеля падгатоўкі кваліфіцыраваных культурна-асьветных працоўнікаў беларускіх школаў апрача заўсягдашніх педагогічных установаў (Беларускі педагогічны тэхнікум і пед. аддз. Б.Д.У.) існавалі беларускія курсы: 1-гадавыя дашкольныя, 10-ці месячныя настаўніцкія і 9-ці месячныя лектарскія. К вялікаму жалю за недахватам матар'яльных сродкаў дашкольныя курсы згодна пастановы ЦИК часова зачыняны, пакуль ня будуць знайдзены сродкі на іх сутрыманьне. Гэта вялікая страта для беларускіх дашкольных установаў, бо кваліфікацыя працоўнікаў гэтых установаў сутрымаецца, як відаць, на доўгі час. Беларускія настаўніцкія курсы працуюць вельмі добра. Выпуск новых маладых працоўнікаў для першых груп школаў яны зробяць к будучаму навуковаму году. Беларускія лектарскія курсы далі першы выпуск на 1 красавіка гэтага году. Яны даюць досыць падгатаваных працаўнікоў для поўных сямігадовых школаў. Вельмі шкода, што за адсутнасьцю матар'яльных сродкаў гэтыя курсы ня могуць істнаваць далей. Курсы гэтыя—тая ячэйка, той фундамэнт, на яком будзе будавацца далейшая праца па адраджэньню бел. пралетарска-сялянскай культуры. Захаваньне на далейшы час гэтых курсаў вельмі пажадана і НКА. патрэбна абавязкова знайсьці матар'яльныя сродкі дзеля сутрыманьня гэтых курсаў і набраньня новых слухачоў.

Акрамя курсаў, якія ужо пералічаны, Беларускі Аддзел мае на мэце адчыненьне летніх каротка-тэрміновых курсаў беларусазнаўства, праз якіяпавінны прайсьці ўсе настаўнікі як у цэнтры, так і на паветах. Курсы гэтыя павінны будуць даць той агульны напрамак працоўнікам школаў гораду і вёскі, які патрэбны дзеля правідловага і інтэнсіўнага разьвіцьця маладой пралетарска-сялянскай беларускай культуры. Яны так сама павінны будуць згуртаваць, аб'яднаць наша настаўніцтва, а можа нават і аддзяліць тую частку настаўніцтва, якая варажна настроена проціў гэтай культуры працоўных пакрыўджаных масаў. Гэтая апошняя частка пеўна будзе выдзелена і послана дзеля працы туды, дзе няма беларускай школы, дзе ня чуваць гэткай мужыцкай мовы, дзе працу можна будзе павясьці так, як гэта пажадана гэтай групе настаўніцтва. А тыя, якія застануцца ў нас для працы новым шляхам к новаму жыцьцю павядуць цёмныя працоўныя масы. Курсы павінны будуць адчы-

ніцца як у Менску, так і на паветах. Крэдыты на арганізацыю і сутрыманьне гэтых курсаў запрошаны: чакаецца толькі зацьвярджэньня каштарысу з цэнтру.

Для тэхнічнага выданьня беларускіх падручнікаў і літаратуры Бел. Аддзелам атрымана з цэнтру выключна на беларускае выдавецтва ў круглых лічбах 6000 пуд. паперы, якая цалкам передана як пай НКА Беларускаму каапэратыўнаму выдавецтву дзеля надрукаваньня белар. падручнікаў і літаратуры па указаньню А. Ц. Н. К. А. Б. Акрамя гэтага беларускія падручнікі друкуюцца ў Бэрліне, Лейпцыге і Вільні. К будучаму вучэбнаму году ўсе беларускія ўстановы будуць здаволяны як падручнікамі, так і літаратурай, а гэта адно ўжо гарантыруе нам тое, што беларуская школа выйдзе на шырокі шлях, а разам з ёю рушыцца ў народ і беларуская пралетарска-сялянская культура. Што датычыць здавольненьня беларускіх школаў падручнікамі і літаратурай, то агульным лікам разьмяркована паміж культурнаасьветнымі ўстановамі Беларусі ў круглых лічбах 150000 экз. кніг. Па тэхнічным умовам кнігі гэтыя дайшлі ў установы з запазданьнем. Прыймаюцца крокі к здавальненьню ўсіх культурнаасьветных установ з будучага вучэбнага году поўнасьцю і к пачатку навуковага году. Апрача кніг, распаўсюджаных па Беларусі паслана на запатрабаваньням ад устаноў, якія знаходзяцца на абшарах РСФСР., Украіны, Сыбыры і Тюркскіх Рэспублік, а так сама вайсковых часьцёх да 10000 экз. кніг. Аб высылцы кніг вайсковым арганізацыям часткай пісалася ў газэце «Савецкая Беларусь».

Беларуская культура жыва, мацнее; цікавасьць і прыхільнасьць да гэтай культуры расьце з кожным днём. Праца Бел. Аддзелу ў напрамку адраджэньня беларускай нац. культуры не прападзе марна, гэта яго надзея, гэта яго ідэал.

Ме—іч.

З жыцьця Беларускага Джяржаўнага Унівэрсытэту.

Урачыстае шанаваньне Я. Купалы.

19 сакавіка, ў нядзелю, аб першай г. д. у актавай залі Беларускага Джяржаўнага унівэрсытэту адбылося урачыстае пасяджэньне Рады унівэрсытэту ў прысутнасьці значнай лічбы беларускіх культурных дзеячоў і іншай публікі дзеля ушанаваньня вядомага поэта Я. Купалы.

Метаю Рады унівэрсытэту было адзначыць асаблівую вартасьць славутага паэты для разьвіцьця беларускай культуры.

Пасяджэньне адчыніў сваёй прамовай рэктар унівэрсытэту праф. Пічэта.

Адзначыўшы, што ў творчасьці Я. Купалы выяўлены ўсе рысы, па якім беларусы павінны лічыць яго сваім вялікім пісьменнікам, прамоўца правеў тую думку, што Я. Купала мае для беларусаў такую самую вартасьць, якую Т. Шэўчэнка для украінцаў, А. Міцкевіч для палякоў і А. Пушкін для расейцаў.

Посьле ўступнай прамовы праф. Пічэты прачоў свой даклад на расейскай мове «Я. Купала, как индивидуалист» доктар унівэрсытэту М. Н. Піотуховіч.

Дакладчык адзначыў, што Я. Купала зьяўляецца выдатным індывідуалістаю і у яго творах досыць выразна выступаюць рысы індывідуалізму: самаўглубленьне, імкненьне да самаасабовасьці, любовь да прыроды і г. п.

У параўненьні з расейскімі пісьменьнікамі—індывідуалістамі (К. Бальмонт, Ф. Салагуб і інш.) творчасьць Купалы знаходзіцца на больш жыць-

цёвым груяце з той прычыны, што адзначаныя расейскія індывідуалісты ў шмат якіх сваіх творах сталі на няпеўны шлях дэкадэнства, якое не расквітнеўшы, памерла. Купала-ж, на вялікую карысьць для беларускай літаратуры, зусім ухіліўся ад адзначанага шляху. Яго індывідуалізм, па думцы дакладчыка, знаходзіцца ў цеснай сувязі з агульна-грамадзянскім настроем. З адзначанага напрамку Я. Купала ня сходзіць у працягу ўсёй сваёй літаратурнай дзейнасьці.

Сымбалізм таксама займае, па думцы дакладчыка, выдатнае месца ў творах Я Купалы. Так, напрыклад, «Раскіданае гняздо» беднай беларускай сямейкі, апісанае ў драме пад тэй-жа назвай, зьяўляецца сымбалем шмат вякоў многапакутнай Беларусі. Адзін з гэрояў драматычнай поэмы «Сон на кургане»—Сам ёсьць ніхто іншы, як беларус, шукаючы сваё шчасьце.

Наступны дакладчык праф. У. М. Ігнатоўскі ў сваім дакладзе на беларускай мове «Соцыяльна-палітычныя матывы у творах Я. Купалы» правеў тую думку, што сацыяльна-палітычнае адраджэньне беларускага народу зьяўляецца адным з галоўных матываў творчасьці Я. Купалы. Яго нацыяналізм заўсёды грунтуецца на соцыяльных пытаньнях. Гэты нацыяналізм нідзе не выглядае ў песьняра, як нешта асобнае, а заўсёды знаходзіцца у цеснай сувязі з думкамі аб родным народзе і яго палітычна-соцыяльным становішчы. Вышэй за усё пясьняр ставіць працу, якая зьмяняе нават самы выгляд зямлі. Апісваючы ў сваіх творах жыцьцё беларуса з усіх бакоў, пясьняр бачыць прычыны яго цяжкага становішча ў нацыянальнай няволі, у безьзямельлі, у поўнай залежнасьці ад панскай ласкі у адміністрацыйным уціску, у нясьвядомасьці і цемры.

Нарэшце зрабілі даклады на расейскай мове, лект. універсытэту А. Н. Вазьнясенскі і член ураду унів. т.С. З. Кацэнбогін.

У сваім дакладзе лект. Вазьнясенскі зрабіў параўнаньне лірыкі Я. Купалы з народнай творчасьцю, а т. Кацэнбогін паказаў, што лірыка Я. Купалы зьяўляецца праўдзівым адбіткам пакутнага жыцьця беларускага народу, як сам паэта—выдатным ідэолёгам нацыянальнага адраджэньня Беларусі.

За дакладамі адбылася літаратурна-мастацкая часьць урачыстасьці, у якой прыймалі гарачы ўдзел артысткі і артысты Беларускага Дзяржаўнага Акадэмічнага Тэатру, а таксама і хор Тэатру.

Дэкламацыя і сьпевы—музыкі Ул. Тэрраўскага—складаліся выключна з твораў Я. Купалы.

У канцы літаратурна - вакальнай часьціны па просьбе арганізатараў урачыстасьці, Я Купала прачытаў свой уласны верш «Перад будучынай». Як толькі шаноўны пясьняр узыйшоў на катэдру, публіка зрабіла яму бурную авацыю.

Посьле гэтага студэнт Унівэрсытэту, малады пясьняр Міхась Зарніца, з шчырым пачуцьцём прадэклямаваз уласны верш, прысьвячоны ўслаўляемаму пясьняру, пад назвай «Вялікаму пясьняру Бацькоўшчыны».

Пела, гудзела чароўная ліра.
Гучна нясьліся кругом адгалоскі;
Струны жывыя даводзілі шчыра
Горкія мукі і радасьці вёскі.

Ясная ліхтарняй на вежы-званьніцы,
Зоркаю сьветлай маніў да сябе:
Бляскам агністым сьвіталі зарніцы,
Край абуджаўся, ішоў к барацьбе.

Помню—у садзе пад сьпеў навальніцы,
У цемнай альтанцы сярод гушчары
Пеў на «Жалейцы» і піў як з крыніцы
Сокі цудоўныя з раньняй пары.

Потым сьціхалі грымоты... Альтанкі
Жомчугам лісьце блішчэла ад сонца...
Стадак дамоў ужо гналі на ранкі...
Вёскі, маленства, малюнкі бязконца...

«Градам» забіла зусім бедака.
Быльнік па бацькаўскі гонях парос
З клічам тваім «Пажалей мужыка»!
Кожны ўздыхнуўшы надзеяй васкрос.

Волатам вёсак і пушчаў вяковых,
Сынам краіны і родных палёў
Квітні Купальнымі красками новых—
Сьветлых, нясьмертных, агністых вянкоў.

Урачыстасьць закончилася каля 5 гадз. в. пеяньнем беларускай марсэльезы «Ад веку мы спалі»...

Памяці А. Бурбіса.

Двацатага сакавіка памёр Намесьнік Камісара Замежных справаў Б. С. Р. Р. Александра Лаўрэнцевіч Бурбіс.

Нябошчык быў даўнейшым рэвалюцыйным дзеячом беларускага адраджэнскага руху.

Сябра Беларускай Социялістычнай Грамады, ён пачаў сваю рэвалюцыйную дзеяльнасьць яшчэ да рэвалюцыі 1905 г. Ён стаў працаваць ў беларускіх рэвалюцыйных кругох ў 1902 г.

У 1906 г. А. Бурбіс быў арыштованы Царскім урадам і папаў у турму, дзе ён адсядзеў каля трох гадоў.

Турма падкасіла фізычныя сілы А. Бурбіса; адгэтуль ён вынес сухотку—хваробу, ад якой ён і памёр.

Але турэмнае заключэньне не скасіла яго рэвалюцыйнага настрою. Ён ня спыніў сваей дзеяльнасьці на карысьць беларускага руху: ён прымае актыўны удзел у культурнай працы віленскіх адраджэнцаў; наладжывае беларускія культурна-асьветныя і музыкальныя установы, беларускія хоры й тэатральныя таварыства, сам працуе, як артыста, раз'еджджаючы з тэатрам Буйніцкага.

Рэвалюцыя 1917 г. застала А. Бурбіса за межамі Беларусі ў Петраградзе й Маскве, але гэтая рэвалюцыя адчыніла шырокі простор яго дзеяльнасьці на карысьць Беларусі. У Петраградзе ён сумесна з А. Чарвяковым і йншымі дзеячамі арганізуе беларускія рэвалюцыйна-вайсковыя гурткі, а ў Маскве зьяўляецца прадстаўніком беларускіх нацыянальных інтарэсаў ў Камісарыяце Замежных спраў. Як прадстаўнік Маскоўскага Камісарыяту, ён ў 1919 г. прыехаў у Менск, каб працаваць на роднай беларускай глебе. Але пачалося наступленьне палякоў і А. Бурбіс уехаў у Маскву. У 1920 г. посьле адходу палякаў ён зноў вяртаецца ў Менск і працуе з пачатку ў Камісарыяце Земляробства, калі-ж у 1921 г. быў з'арганізованы Камісарыят Замежных справаў, прымае на сябе яго кіраўніцтва на пасадзе намесьніка Камісара. Ён тут аддае свае апошнія сілы для працы на карысьць Беларусі й ні на словах толькі, а і на дзеле выяўляе сябе гарачым прыхільнікам роднай беларускай мовы—Камісарыят Змежных спраў быў адзіночным камісарыятам па Беларусі, які пачаў весьці ўсё дзелаводства *толькі* ў беларускай мове.

Палітычны й грамадзянскі дзеяч рэвалюцыянер-агітатар, мастак-артыста А. Бурбіс быў і літаратарам-пісьменьнікам у роднай мове.

Пісаць ён пачаў яшчэ ў «Нашай Долі» і «Нашай Ніве» у маладых гадох і не пакінуў гэтай працы да канцу свайго жыцьця, працуючы ў Менску іменна ў «Весьніке Наркамасьветы». У 1921 г. у 1-ым і 2-м нумерох «Весьніка» зьявіўся яго цікавы артыкул «Кароткі агляд Беларускага нацыянальна-рэвалюцыйнага руху» (псэўданім—«Стары Піліп»).

Працаваць над гісторыяй беларускага руху А. Бурбіс пачаў яшчэ ў бытнасьць сваю ў Маскве і там сабраў шмат матэр'ялаў, якія ўзяў для сваей кніжкі «Очерк истории национального и революционного движения белоруссов» праф. Белар. Дз. Унів. Хфедар Хфедаравіч Турук.

У сераду, 22-га сакавіка, адбылося пахаваньне Алеся Бурбіса. Вынас цела адбыўся а $5^1/_2$ гадзіне ўвечары з гасьцініцы «Парыж» на Старажоўскія могілкі. У пахаваньні прымалі ўдзел вайсковыя часьці мясцовага гарнізону, камуністычная партыя Беларусі, усе беларускія арганізацыі і інш. установы.

Перад вынасам цела з кватэры Беларускі Дзяржаўны хор, быўш. Тэраўскага, прапяяў пахавальны марш, марсэльезу і міжнародны гымн, а тав. Чарвякоў сказаў прамову, посьле чаго ўся працэсія пад гукі пахавальнага маршу пяцёх вайсковых духавых аркестраў пакіравалася на могільнік.

На могілках казалі прамовы прадстаўнікі ад розных арганізацыяў—т. Кнорын—ад камуністычнай партыі Беларусі, т. Ігнатоўскі ад Беларускага Чырвонага Крыжу, т. Лёсік ад Інстытуту Беларускай Культуры, т. Дыла ад Цэнтрабелсаюзу і інш.

З гэтых прамоваў найбольш за ўсе абрысована было асабовасьць нябошчыка і сэнс яго дзеяльнасьці і смерці ў прамове Я. Лёсіка.

«Таварышы і грамадзяне», казаў прамоўца, «Я прышоў сюды, каб ад імя Інстытуту Белар. Культуры прынесьці апошняе ўшанаваньне і перадаць апошняе прашчай найлепшаму сыну Беларусі, добраму грамадзяніну і дарагому нашаму таварышу Аляксандру Бурбісу. Як чорная хмара зьвісла над Беларусьсю пахавальная жалоба. Адзін за другім заходзяць у магілы найлепшыя людзі нашай многапакутнай старонкі, нашыя нацыянальныя прарокі. У самым пачатку рэвалюцыі зышоў у сырую зямельку наш слаўны паэт пясьняр хараства Максім Багдановіч.

Роўна цераз год пашоў за ім у халодную магілу так сама ад сухот другі наш паэта беларускі лірнік Каганец. А яшчэ цераз год за імі ўсьлед пайшоў у маладым 37 летнім веку рэвалюцыянэр, піанэр беларускага адраджэньня, публіцыст Іван Луцкевіч, памёршы гэтак сама ад сухот. А пазалетась увосень дзесь у далёкай Галіцыі пахавалі яшчэ аднаго нашага рэвалюцыянэра й слаўнага паэта, перажыўшага ў Сібіры вечнае пасяленьне да рэвалюцыі, Алеся Гаруна. У Галіцыі ён лячыўся ад сухот і памёр, пайшоў як сьвечка да неба і панёс з сабою свае «думкі-дыямэнты». А вось сёлета, яшчэ на прошлым тыдні заграднічныя газэты прынесьлі новую жалобную вестку а сьмерці найстарэйшага адраджэнца і пісьменьніка Ядвігіна Ш., Антона Лявіцкага і—гэтак сама ад сухот. А сёньня мы зышліся сюды, каб пахаваць у сырую зямельку новую ахвяру сухот—рэвалюцыянэра і слаўнага беларуса адраджэнца Аляксандра Бурбіса.

Як чорная хмара, зьвісла над Беларусьсю пахавальная жалоба.

Што-ж гэта за фатальная доля такая, што ўсіх іх скасіла сьмерць сухотамі? Дзе прычына таго, што беларускі пісьменьнік, беларускі грамадзянскі дзеяч, беларускі рэвалюцыянэр уміpae ад сухот,—ад хворасьці, што разьвіваецца толькі ў падвойна-цяжкіх, у падвойна ненармальных умовах жыцьця?

А прычына тут тая, што яны былі ня толькі паэтамі і пісьменьнікамі, ня толькі грамадзянскімі дзеячамі, ня толькі рэвалюцыянэрамі-сацыялістамі і камуністамі, а былі яны яшчэ і беларусінамі. Яны нясьлі на плячох сваіх падвойны цяжар, падвойны крыж, і гэтым другім крыжам за рамю іх была беларуская справа, нацыянальнае адраджэньне. У дарэвалюцыйныя часы, у часы царызму быць беларусам—гэта значыла наразіць сябе на ўсе няшчасьці сьвету гэтага. Арэштам, астрогам, кайданамі, Сібір'ю і катаргай карaў беларуса царызм, а насьмешкі, зьдзек, зьневажэньне і гвалт сустракаў беларусін збоку ўсяго грамадзянства, пачынаючы ад пана буржуя і канчаючы хамам пралетарам, Беларусін у дарэвалюцыйныя часы—гэта шалены, вар'ят, камэдыянт, апошні чалавек, з каторым ганьбавалі вітацца знаёмыя, а свае родныя выракаліся і праклінaлі, як адшчапенца і вырадка. Гэтага цяжару, гэтай пякельнай мукі ня мог вытрымаць ніякі, нават жалезны чалавечы арганізм. А цяпер? Хіба не абліваецца крывёю сэрца беларусіна, пазіраючы на тое, як яго маць і—краіна разрэзана на часьці, як жывое чалавечае цела? Хіба гэта не пякельная мука, хіба гэта не агонь, з полымем каторага ня можа супярэчыць ніякае чалавечае жыцьцё?!...

Вось гэтага падвойнага цяжару, гэтай мукі ня мог вытрываць і нябошчык А. Бурбіс,—захвараў ён на сухоты ды памёр. Ня выдзержалі сілі яго таго непамернага цяжару, каторы ўзлажыў ён на рамя свае і нёс аж да сьмерці з самага пачатку 900 годоў. Нябошчык вышаў на нацыянальна-рэвалюцыйную працу даўно, яшчэ маладзенькім хлапчуком, працаваў 22 гады і спачываў хіба толькі тады, калі царскі ўрад садзіў яго ў вастрог. Нябошчык быў першым сьвядомым беларусінам-сацыялістам; ён першы выступаў на мітынгах, на сходах з рэвалюцыйнымі прамовамі пабеларуску. У тыя дарэвалюцыйныя часы публічнае выступленьне пабеларуску было так неспадзявана, як гром у ясную пагоду. А што важней за ўсё, дык гэта тое, што нябошчык быў першым у ліку тых, хто ў 1902 г. прагаласіў лёзунг незалежнасьці Беларусі, хто беззяржаўнай незалежнасьці ня бачыў сацыяльнага

вызваленьня працоўных мас. Нябошчык Бурбіс быў першым закладчыкам першай рэвалюцыйна-нацыянальнай беларускай партыі «Бел. Сац. Грамады».

Апошнім часам ён стаў камуністам, але ані на момант не забываў, што не «едзіным хлебам жыў бывае чалавек», што ў царства сацыялізму ўвойдуць не пралетары краёў, а пралетары народаў, што сацыялістычны інтэрнацыянал гэта ня сума людзей без нацыянальнага твару, а грамада нацыянальнага твару, а грамада нацыянальна сьвядомых народаў. Коратка кажучы, нябошчык разумеў, што без нацыянальнага вызваленьня ня можа быць і сацыяльнага вызваленьня. А нацыянальнае вызваленьне ён мысьліў, як поўную непадзельную дзяржаўную незалежнасьць для свайго беларускага народу. Але не дажыў да гэтага шчасьця. Ён пакінуў свой народ, сваю Маці Беларусь яшчэ ў муках вызваленьня, падзеленую на часьці. Адну ён меў нагароду за сваю цяжкую працу беларусіна-рэвалюцыянэра. Перад сьмерцю ён ужо мог узайсьці на тую высокую гору, адкуль, як Майсей, пазіраў Абяцаную Землю Беларускага Народу. Ён ужо бачыў тыя шырокія сьветлыя прасторы, пад якімі запануе многапакутны беларускі народ, дзе ён будзе гэтак сама працаваць, жыць і бароцца за новае і яшчэ лепшае жыцьцё але барацьба яго асалодзіцца нявымоўнаю радасьцю свае ўласнай нацыянальнай творчасьці, каторай не адчуваюць і не разумеюць усе нацыянальна сытыя народы.

Сьпі-ж спакойна, беларускі прарочы Ты не дайшоў яшчэ да Абяцанае Зямлі, ня дойдзе яшчэ і шмат хто з нас, бо ўсе мы ў няволі радзіліся і мусім памерці, як тое жыдоўства, што вадзіў Майсей па пустыні.

Спачывай, найлепшы сыне Беларусі! Імя тваё не забудзецца ніколі! Чырвонымі, агнёвымі літарамі будзе упісана яно ў гісторыі нацыянальнага адраджэньня і рэвалюцыйнага руху Беларусі!

Тут у роднай зямельцы, у жоўтым пясочку, тут, быць можа, у грудзе знойдуць твае слабыя грудзі сабе пакой! А ты, родная... Ня будзеш цяжкая ты сыну свайму зямля!»

Т. Ігнатоўскі у сваей прамове адзначыў, что перад сьмерцю, калі нябошчык быў зусім бяз памяці, ён сказаў гэткія словы: «вясковыя настаўнікі», а пачакаўшы— «чырвоная армія». Гэтыя словы з першага погляду могуць паказацца, што яны нічога асаблівага не азначаюць, але калі мы праналізуем іх і возьмем пад увагу яго заўсёдную цяжкую працу, дык мы можам сьмела сказаць, што тав. Бурбіс заўсёды мысьліў і меў на ўвазе, што галоўная зброя вызваленьня працоўнага народу з прыгону капіталістаў і цемры, гэта Асьвета і Чырвоная Армія. Асьвета і Чырвоная Армія—гэта фундамант сацыялістычнай працы, без чаго працоўны народ ніколі ня зможа пабудаваць свайго шчасьця. Гэта нябошчык добрэ разумеў, будучы яшчэ здаровым, за гэта ён змагаўся, з гэтымі словамі пашоў і ў магілу. Наш абавязак—зразумець гэтыя словы і шчыра ўзяцца за тую працу, якую вёў нябошчык Бурбіс».

М. Байкоў.



Указатель статей,

помещенных в I–VI вв. „Вестника Нар. Ком. Просв. С. С. Р. Б.

Организационные вопросы.

Просвещение и партия.

Общие вопросы науки.

Педагогика, методология и история образования.

Высшая школа.

Проф.-техн. образование.

Библиотечное дело.

Белорусская литература и история.

Библиография.

Хроника.

Беларускі аддзел.

Літаратура, гісторыя, публіцыстыка.

Беларуская навуковая тэрміналёгія.

Культурная праца и культурныя установы.

Кнігаопіс і крытыка.

Хроніка.

Р. В. Ц. № 327. 1 Сав. друк. з. № 1471.